Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII год выданьня штодзённая газэта

ЧАЦЬВЕР
9 ЛЮТАГА 1933 г.
№ 32 (3692)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказны рэдактар 789
Адказны сакратар 4-78
Сэкратар . . . 6-15
Начная рэдакцыя 12-65 (два званкі)
Выдавецтва . . . 2-44

АЎТАМАТЫ:
Адк. рэдактар . 20-831
Адк. сакратар . 22-161
Сэкратары . . . 22-160
Кантора . . . 22-158

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . 2 р. 40 к.
3 „ . . 7 р. 20 к.
6 „ . . 14 р. 40 к.
Падпіска прымаецца выключна на пошце і лістаносцамі.
Рукапісы не вяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.
КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радок компарэкі 1 руб. 50 к.
КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
аб агубе 1 дакумэнту 2 руб.

Сеньня у нумары

ПАЧАЛА ПРАЦУ IV СЭСІЯ ЦВК БССР X-га СКЛІКАНЬНЯ. Прамова т. А. ЧАРВЯКОВА на адкрыцьці Сэсіі ЦВК БССР (1-я стар.).
Прамова т. ЛІТВІНАВА на генэральнай канфэрэнцыі па разбраеньні (2-я стар.).
СТЭЦКІ: Лекіі і сацыялістычны шлях (3-я стар.).
Р. Б. Капгасы табарам вандруюць 3-я стар.).
Ул. ДУБРОЎСКІ: Пракурор, куплены кулаком (4-я стар.).
Па справе сакратара Крычаўскага РК КП(б)Б т. РЫНДЗІЧА. Пастанова прэзыдыуму і парткалегіі ЦКК КП(б)Б (4-я стар.).
Ня толькі засыпаць—неабходна арганізаваць пільную ахову (3-я стар).
15 лютага—Усесаюзны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў. (1-я стар.).
БАРАЦЬБА ЗА ФІНЛЯН: Ісьці ў ногу з перадавымі (2-я стар.).

Прамова тав. А. Чарвякова на адкрыцьці сэсіі ЦВК БССР

Таварышы! IV Сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі пачынае сваю работу у той гістарычны пэрыяд, калі рабочая клясa і працоўныя масы Савецкай Беларусі разам з рабочай клясай і працоўнымі масамі Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам Кампартыі разгортваюць работу па выкананьні задач першага году другой пяцігодкі—пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва у Савецкім саюзе.

Мы змаглі прыступіць да вырашэньня гэтых задач дзякуючы вялізарным посьпехам сацыялістычнага будаўніцтва ў першую пяцігодку, скончыўшы гэтую пяцігодку у чатыры гады.

За час першай пяцігодкі мы дабіліся вялізарных посьпехаў у справе гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Важнейшым палітычным вынікам першай пяцігодкі зьяўляецца тое, што першая пяцігодка паказала, што капіталістычная сыстэма гаспадарства бязгрунтоўная і няўстойлівая, што яна ўжо аджывае свой век і павінна аддаць свае месца другой вышэйшай савецкай сацыялістычнай сыстэме гаспадарства, што адзінаю сыстэмаю гаспадарства, якая не баіцца крызысаў і адольна перамагчы цяжкасьці, невырашальныя для капіталізму зьяўляецца савецкая сыстэма гаспадарства».

Савецкая Беларусь у барацьбе за выкананьне першай пяцігодкі ня толькі не адставала ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, але па цэламу шэрагу галін яна ішла ўперадзе. І таму мы маем магчымасьць сёньня адзначыць вялізарныя посьпехі гаспадарчага і культурнага сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі, дзякуючы якім Савецкая Беларусь ператварылася з краіны аграрнай у краіну індустрыяльную, з краіны з дробнай сельскай гаспадаркай ў краіну буйнай сельскай гаспадаркі, з краіны з прыватнай сельска гаспадаркай ў краіну сацыялістычнай, з краіны някультурнай, няпісьменнай у краіну суцэльна-пісьменную, у краіну усеагульнага абавязковага навучаньня, у краіну з пышным росквітам вышэйшай і сярэдняй тэхнічнай асьветы, у краіну дзе будуецца сацыялізм, дзе ствараецца новая культура—пралетарская па зьместу і нацыянальная па форме.

На падставе гэтых вынікаў першай пяцігодкі для Савецкай Беларусі мы можам сказаць, што Савецкая Беларусь зьяўляецца найбольш яскравым прыкладам таго, што толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, толькі пад кіраўніцтвам кампартыі сапраўды па ленінску вырашаецца нацыянальнае пытаньне.

IV Сэсія Цэнтральнага выканаўчага камітэту Савецкай Беларусі пачынае сваю працу непасрэдна пасьля Пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), і пасьля III Сэсіі ЦВК Саюзу ССР. Пастановы Пленуму і гэтай Сэсіі зьяўляюцца важнейшым этапам у справе далейшага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя пастановы даюць праграму і напрамак нашай работы ў далейшым, зьяўляюцца тымі важнымі дырэктывамі, якімі мы павінны кіравацца, распачынаючы працу IV Сэсіі ЦВК Савецкай Беларусі.

Адным з першых і важнейшых пытаньняў, што нам трэба будзе разгледзець на Сэсіі ЦВК БССР, зьяўляецца пытаньне аб кантрольных лічбах на 1933 год.

Кантрольныя лічбы на 1933 г.—першы год другой пяцігодкі—вялізарная, грандыёзная праграма далейшага сацыялістычнага будаўніцтва. Але абгаворваючы пытаньне аб першым годзе 2 пяцігодкі, нам неабходна асаблівую увагу зьвярнуць на той асобны характар, які маюць планы 1933 году і па Савецкаму саюзу і па Савецкай Беларусі.

Пленум ЦК УсеКП(б), кажучы аб гэтым асобным характары, падкрэсьліў, што «галоўны упор у другую пяцігодку павінен быць зроблен не на колькасны рост прадукцыі, а на палепшаньне якасьці прадукцыі і рост прадукцыйнасьці работы у прамысловасьці, не на пашырэньне пасеўных плошчаў, а на рост ураджайнасьці у земляробстве, на палепшаньне якасьці работы ў сельскай гаспадарцы».

Адсюль ні ў якім разе нельга зрабіць вывад аб тым, што, быццам, можна менш ўвагі ўдзяляць пытаньням колькаснага разгортваньня нашай работы.

Наша задача будзе заключацца ў тым, каб забясьпечыць поўнае выкананьне колькасных паказчыкаў народна-гаспадарчага пляну 1933 г. Але галоўны ўпор мы будзем рабіць на якасны бок нашай работы, выходзячы з таго, што і колькасныя паказчыкі мы зможам забясьпечыць толькі на падставе поўнага выкананьня ўсіх якасных паказчыкаў.

6 умоў тав. Сталіна і барацьба за іх выкананьне павінны зьявіцца нашым сьцягам, пад якім мы пойдзем уперад па шляху пераможнага выкананьня задач першага году другой пяцігодкі.

Неадрыўна ад народна-гаспадарчага пляну на 1933 г. будзе стаяць пытаньне аб дзяржаўным бюджэце на 1933 г. Праз бюджэт мы мабілізуем сродкі, праз бюджэт мы разьмяркоўваем гэтыя сродкі, праз бюджэт мы забясьпечым выкананьне пляну першага году другой пяцігодкі і наогул нашых народна-гаспадарчых пляноў. Такім чынам поўнае выкананьне бюджэту ёсьць гарантыя поўнага выкананьня народна-гаспадарчага пляну.

Вось чаму, таварышы, абгаварваючы бюджэт, нам неабходна таксама звярнуць сур'ёзную ўвагу на наступныя патрабаваньні, якія прад'явілі нам і пленум ЦК і ЦККП нашай камуністычнай партыі і III Сэсія ЦВК Саюзу ССР па пытаньню аб бюджэце: «Захаваць не самай строгай бюджэтнай і фінансавай дысцыпліны, як па прыбытках, так і па выдатках, цьвёрдае праведзеньне гасразьліку і дагаворнай дысцыпліны паміж гаспадарчымі органамі, недапушчэньне якога-б там ні было пазапланавага будаўніцтва».

Абгаварваючы бюджэт, мы ў той жа самы час павінны прывучыць самих сябе, а таксама заклікаць усе савецкія, усе гаспадарчыя арганізацыі, кожнага паасобку працаўніка да самай суровай бюджэтнай дысцыпліны, да самага строгага і эканомнага выдаткаваньня сродкаў, якія мы мабілізуем праз дзяржбюджэт.

Важнейшым пытаньнем, якое стаіць у парадку дню IV Сэсіі ЦВК зьяўляецца даклад аб паслыных плянах на 1933 г. і практычных мерапрыемствах па ўмацаваньні калгасаў. Мы маем, таварышы, важнейшыя гістарычныя пастановы па ўсім гэтым пытаньням, як з боку ЦК камуністычнай партыі, так і з боку савецкага ураду, мы маем так сама разгорнутую праграму працы ў вёсцы, якую даў у сваёй прамове т. Сталін. Важнейшым пытаньнем на даным этапе зьяўляецца ўзьняцьце ўраджайнасьці, арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў. «Барацьба за далейшы ўздым сельскай гаспадаркі, завяршэньне ж сацыялістычнай перабудовы зьяўляецца ў цяперашні момант важнейшай задачай партыі». Увага ўсіх парт. арганізацый, увага савецтаў павінна быць зьвернута на тое, што ад іх непасрэднай работы, ад якасьці гэтай работы залежыць нас пяховае вырашэньне гэтай важнейшай задачы.

Мы ставім у парадку дню нашай Сэсіі пытаньне аб пасяўной кампаніі. Ставячы пытаньне аб пасяўной кампаніі ў парадку дню Сэсіі, мы ўлічваем усю сур'ёзнасьць усю важнасьць гэтага пытаньня, выходзячы з таго, што пасьпяховае вырашэньне вясеньняй пасеўнай кампаніі павінна садзейнічаць далейшаму арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў, павінна садзейнічаць калгаснаму будаўніцтву, павінна садзейнічаць замацаваньню сац. форм сельскай гаспадаркі.

Я хачу зьвярнуць увагу прыехаўшых таварышоў на тое, што пры абгаварэньні гэтага пытаньня трэба ўлічыць тыя ўрокі, што мы атрымалі за час загатаўчальнай кампаніі. У час загатоўчай кампаніі, калі мы непасрэдна паишлі ў вёску, калі мы прад'явілі сельска-гаспадарцы патрабаваньні аб выкананьні ёю сваіх абавязкаў перад дзяржавай, мы сустрэліся з радам хваравітых зьяўішч і недахопаў у нашай рабоце на вёсцы. Вурокі нарыхтовак па Сав. Беларусі цалкам і поўнасьцю пацьвердзілі выкрытыя ў прамове тав. Сталіна карэньні недахопаў нашай працы ў вёсцы, якія выявіліся ў недаацэнцы падвойнай прыроды калгаснага гандлю, ў спробах пад мяніць дакладнае бальшавіцкае кіраўніцтва калгасным рухам—дробна-буржуазнай ідэалізацыяй, няўменьні выкрыць новыя манэўры клясавага ворагу і дабіцца ачысткі ад кулацкіх і контр-рэвалюцыйных элемэнтаў, якія выявіліся ў ліберальных адносінах партыйных і савецкіх арганізацый да нарыхтовак.

Гэтыя вурокі загатоўчай кампаніі нам трэба, таварышы, улічыць з асаблівай вастратой, з прычыны таго, што, відаць ня ўсімі ішчэ, як цэнтральнымі, гэтак і мясцовымі арганізацыямі гэтыя вурокі ўлічаны што ня ўсе арганізацыі ўразумелі сур'ёзнасьць нашай работы на вёсцы і не перабудавалі ад паведным чынам сваю работу. Мы маем ужо трывожныя сыгналы ў цэнтральным органе камуністычнай партыі ў «Правде» аб тых непаладках, якія маюцца ў нашых цэнтральных беларускіх установах у справе падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўнай кампаніі. «Правда» зусім правільна сыгналізуе нам аб тым, што, з боку НКЗ. з боку Кіраўніцтва ўпаўнаважанага Наркамзяжпрому, і з боку іншых нашых цэнтральных арганізацый няма адпаведнай перабудовы работы, каб забясьпечыць своечасовую, поўную і пасьпяховую падрыхтоўку да вясеньняй пасеўкампаніі.

Цэнтральны Камітэт камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі і Саўнарком Беларусі ў сваіх пастановах аб падрыхтоўцы да вясновай сяўбы таксама указалі на цэлы рад недахопаў і прарываў у працы як цэнтральных, так і мясцовых установаў у справе падрыхтоўкі да вясновай пасеўнай кампаніі.

Мы, таварышы, учора чыталі ў газэтах пастанову Харкаўскага Абласнога камітэту партыі па пытаньню сяўбы. Харкаўскія бальшавікі са ўсёй бальшавіцкай рашучасьцю выкрылі тыя недахопы, якія маюцца ў працы як партыйных арганізацый, так і савецкіх устаноў Харкаўскай вобласьці і з бязьлітаснай бальшавіцкай рашучасьцю, ускрыўшы гэтыя недахопы, перабудоўваюць свае рады для таго, каб сапраўды па бальшавіцку правесьці сеў першага году другой пяцігодкі.

Я хачу зьвярнуць вашу ўвагу на наступнае месца ў гэтай пастанове «Не абходна самым рашучым парадкам выкараніць вяльможна-панскія мэтады кіраўніцтва паасобных кіруючых працаўнікоў, мэтады, якія выражаюцца ў бюрократычным верхаглядзтве, у няжаданьні ўнікаць у штодзённыя падрабязнасьці ўніцця і работы калгасаў у падмене жывога кіраўніцтва калгасамі папяровым патокам інструкцый і абежнікаў».

Далей ў гэтай жа самай пастанове гаворыцца аб тым, што «нездавальняючая пастаноўка працы зьяўляецца вынікам ня толькі адсутнасьці пільнасьці з боку партарганізацый і паасобных камуністаў, але і таксама простым і непасрэдным вынікам бязьдзейнасьці савецкіх органаў, іх няжаданьня і наўменьня займацца чарнавой працай, буднічнымі штодзённымі пытаньнямі будаўніцтва сельскай гаспадаркі».

Таварышы, мне думаецца, што калі мы глыбока крытычна падойдзем да нашай працы, то ўбачым, што вельмі многае, з можа быць амаль і цалкам усе тое, што сказалі харкаўскія бальшавікі пра працу сваіх устаноў і арганізацый, можна аднесьці і да працы, як цэнтральных так і раённых і сельскіх устаноў і арганізацый Савецкай Беларусі.

Тав. Молатаў у сваёй прамове на Сэсіі ЦВК Савецкага Саюзу папярэджваў нас усіх аб тым, што «ніколі вынікі пасеўнай кампаніі не залежалі так ад пасьпяховай партыйнай і савецкай работы, як у гэтым годзе».

Гэта значыць, што вынікі пасеўнай кампаніі, вынікі арганізацыйна гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў знаходзяцца ў залежнасьці ад нашай працы, ад нашага ўменьня перабудаваць сваю працу, ад нашага ўменьня бязьлітасна выкрываць недахопы сваёй працы, ад нашага ўменьня весьці барацьбу супроць славесных дэкларацыйных адносін да гэтай працы, ад нашага ўменьня весьці бязьлітасную барацьбу супроць клясава - варожых элемэнтаў, што імкнуцца сарваць нашу працу, нашу будаўніцтва.

Тыя прарывы аб якіх сыгналізуе «Правда» і аб якіх гаворыцца ў пастанове ЦК і СНК БССР зьяўляюцца вынікам нашай дрэннай працы, мы самі зьяўляемся вінаўнікамі гэтых прарываў; мы тут у цэнтры і вы ў раёнах на мясцох зьяўляецеся вінаўнікамі гэтых прарываў. Дрэнная нашай працай каў рыстаецца наш клясавы вораг, які пранікае ў шчаліны нашай нядбайнасьці, нашай непаваротлівасьці, нашага няўменьня перабудаваць нашу працу, нашай недастатковай бальшавіцкай адзіцельнасьці, пранікае для таго, каб замацаваць свае пазыцыі, для таго, каб разьвіваць сваю контррэвалюцыйную работу, накіраваную на зрыў сацыялістычнага будаўніцтва. Адсюль мы павінны зрабіць вывад: з бальшавіцкай праматой разгарнуць крытыку і самакрытыку, выкрываючы недахопы сваёй работы, каб іх зьнішчыць, каб гэтым нанесьці новы руйнуючы ўдар па клясавым ворагам

Мы, таварышы, паставілі ў парадак дню гэтай Сэсіі шаксама даклады Жыткавіцкага і Крупскага раённых выканаўчых камітэтаў аб масавай работе саветаў:

Ужо з папярэдняга кожнаму з вас павінна быць зразумела, якое важнае значэньне мае пастаноўка гэтых пытаньняў на гэтым этапе на Сэсіі ЦВК. Калі мы знаходзімся ў прамой залежнасьці ад узроўня працы нашых савецкіх і партыйных устаноў і арганізацый, то, зусім зразумела, што кажучы аб новых задачах, ускрыўшы недахопы нашай працы ў мінулым, мы павінны падумаць аб тым, каб узьняць працу саветаў на вышэйшы узровень, каб дапамагчы саветам перабудаваць іх працу на новыя рэйкі, каб зрабіць дарчым, так і на агульных фронтах сацыялістычнага будаўніцтва.

Вось гэтае абвастрэньне клясавай барацьбы, вось гэтае прыспасабліваньне клясава - варожых элемэнтаў да новых умоў патрабуе ад нас яшчэ большай рэвалюцыйнай пільнасьці, патрабуе ад нас яшчэ больш рашучага і бязьлітаснага змаганьня супроць клясава - варожых элемэнтаў, і гэта павінна зьявіцца аднэй з важнейшых умоў нашага пераможнага прасоўваньня ўперад.

Мы, таварышы, маем у мінулым вялізарнейшыя посьпехі.

Гэтых посьпехаў мы дамагліся дзякуючы таму, што стварыўшы ў час Кастрычнікавай рэвалюцыі савецкую дзяржаву, мы ўсю сваю работу праводзілі, узмацняючы дыктатуру пралетарыяту і вядучы бязьлітасную барацьбу супроць эксплёататарскіх клясаў.

Мы перамаглі дзякуючы таму, што вялі сваю работу пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, ленінскага ЦК, вярнейшага супрацоўніка Уладзіміра Ільліча Леніна, правадыра партыі сусьветнага пралетарыяту т. СТАЛІНА (воплескі).

Мы перамаглі дзякуючы таму, што мабілізавалі рабочую масу і ўсіх працоўных пад кіраўніцтвам кампартыі на змаганьне за генэральную лінію партыі, на змаганьне супроць ухілаў ад генэральнай лініі партыі, супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі, супроць контррэвалюцыйнага трацкізму, супроць «левых», супроць усялякага роду іншых контррэвалюцыйных пераражэнцаў і прымірэнчых да іх адносін

Мы перамаглі, дзякуючы таму, што пасьлядоўна ажыцьцяўляем ленінскую нацыянальную палітыку, змагаючыся супроць вялікадзяржаўнага шовінізму, супроць беларускага контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, супроць шовінізму іншых колераў.

Перад намі стаяць у далейшым новыя адказьнейшыя задачы. Гэта павінна узьняць яшчэ больш нашу волю, нашу энэргію, нашу рашучасьць на барацьбу для выкананьня гэтых задач. Рэвалюцыйны энтузіязм рабочых мас, калгасьнікаў і усіх працоўных, які зьяўляўся аднэй з важнейшых гарантый нашых посьпехаў у мінулым, павінен ляецца і ў далейшым той асновай, аба піраючыся на якую мы будзем вырашаць стаячыя перад намі задачы, мы будзем прасоўвацца ўперад, замацоўваючы дасягнутыя посьпехі і ствараючы ўмовы для далейшага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы будзем працягваць сваю барацьбу пад кіраўніцтвам правадыра партыі і рабочае клясы т. СТАЛІНА.

Уперад, на барацьбу за канчатковую перамогу сацыялізму.

Няхай жыве перамога сацыялізму.

Няхай жыве правадыр — камуністычная партыя.

Няхай жыве дыктатура пралетарыяту.

Няхай жыве правадыр сусьветнага пралетарыяту і камуністычнай партыі т. СТАЛІН. (Воплескі, інтэрнацыянал).

Пачала працу IV сэсія ЦВК БССР X скліканьня

Яркі вогненны транспарант на цэнтральным фасадзе Дому Селяніна апавяшчае:

«IV Сэсія ЦВК БССР X-га скліканьня».

Каля 6 гадзін увечары валя Цэнтральнага Дому Селяніна сапаўняюцца членамі ЦВК БССР, старшынямі РВК, прадстаўнікамі вядучых сельсаветаў, рабочымі, калгасьнікамі, калгасьніцамі, дырэктарамі саўгасаў і МТС, якія запрошаны да ўдзелу ў практычнай працы Сэсіі.

У 6 гадз. 30 хв. увечары адкрылася Сэсія. За сталом прэзыдыуму Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР тав. А. ЧАРВЯКОЎ, Сакратар ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧ, Старшыня Савету Народных Камісараў БССР тав. ГАЛАДЗЕД, Сакратары ЦК КП(б)Б т. т. ЖАБРОЎСКІ, РЫСКІН; Старшыня ЦКК—Нарком РСІ тав. ЛЫЧОЎ, сакратар ЦВК БССР тав. ГНІЛЯКЕВІЧ, старшыня ЦСПСБ—тав. КАВАЛЬЧУК, т. ЗАКОЎСКІ, наркомы т. т. РАЧЬІЦКІ ХАЦКЕВІЧ, БЭНЭК, ГРЫСЕВІЧ, ЛЯУКОЎ і др.

— На Сэсію ЦВК БССР прышоў першы Сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО—кажа тав. ЧАРВЯКОЎ, ёсьць прапанова запрасіць яго ў Прэзыдыум.

Доўга незамоўчнымі воплескамі усталі вітае тав. ГІКАЛО—правадыра камуністычнай партыі бальшавікоў Савецкай Беларусі.

Сакратар ЦВК БССР тав. ГНІЛЯКЕВІЧ абвяшчае парадак дню і рэгламэнт работы Сэсіі, што адзінагалосна зацьвярджаецца.

Адчыняючы Сэсію ЦВК БССР тав. ЧАРВЯКОЎ выступіў з вялікай уступнай прамовай.

Пасьля прамовы тав. ЧАРВЯКОВА з дакладам аб кантрольных лічбах народна-гаспадарчага пляну на 1933 год выступіў Старшыня Народных Камісараў БССР тав. М. ГАЛАДЗЕД, сустрэнуты гучнымі воплескамі.

Дакладам тав. ГАЛАДЗЕДА вячэрняе пасяджэньне скончылася.

Парадак працы IV сэсіі ЦВК БССР

9-га лютага 1933 г.

9-га лютага на раніцнім пасяджэньні IV Сэсіі ЦВК БССР будзе заслуханы даклад т. ПЯТРОВІЧА аб кантрольных лічбах народна-гаспадарчага пляну на 1933 г., і спрэчкі па дакладу т. М. М. ГАЛАДЗЕДА і дакладу т. ПЯТРОВІЧА аб кантрольных лічбах народна-гаспадарчага пляну на 1933 год.

На вячэрнім пасяджэньні 9-га лютага будуць працягвацца спрэчкі па дакладу т. М. М. ГАЛАДЗЕДА і дакладу т. ПЯТРОВІЧА.

Сакратар ЦВК БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ

Дэкаднік Беларускай Акадэміі Навук у Маскве

Праблема „Вялікага Дняпро“

МАСКВА (ТАСС). Праблеме «Вялікага Дняпро» 5-га лютага быў прысьвечаны даклад віцэ-прэзыдэнта акадэміі праф. Т. Ф. Домбаля.

Ідэя злучэньня Чорнага, Балтыцкага і Касьпійскага мораў,—таварыш праф. Домбаль,—узьнікла ў старажытныя часы. Пробавалі вырашыць яе і ў царскай Расіі, але толькі савецкая краіна мае магчымасьць узяцца за канчатковае вырашэньне гэтай буйнай праблемы.

«Вялікі Дняпро» створыць тапны водны шлях і злучыць пяць марэй: Белае, Балтыцкае, Чорнае, Азоўскае і Касьпійскае. Гэта праблема не зьяўляецца толькі транспартнай, энэргетычнай, або мэліярацыйнай. Гэта комплексная праблема, якая ня можа быць аддзелена ад задач усёй народнай гаспадаркі Саюзу.

Што датычыць БССР, дык ажыцьцяўленьне гэтай праблемы павінна быць накіравана да ператварэньня Беларусі ў перадавую індустрыяльную рэспубліку Савецкага Саюзу. Ажыцьцяўляючы на справе ленінскую нацыянальную палітыку, пры вырашэньні праблемы «Вялікага Дняпро», трэба выходзіць ня толькі з неабходнасьці паскарэньня працэсу ліквідацыі рэштак эканамічнай і культурнай адсталасьці былых акраін, але і стварэньня ўсіх умоў для далейшага максымальнага разьвіцьця іх прадуцыйных сіл ва ўмовах сацыялізму.

Беларусь мае вялізарныя паклады торфу і можа быць па праву названа старфяным Данбасам СССР». Вядомы і ясныя багацьці рэспублікі. Ажыцьцяўленьне праблемы «Вялікага Дняпро» дасьць поруч з разьвіцьцём гэтых галін гаспадаркі, магчымасьць асушыць і ператварыць у культурныя палі вялікія забалочаныя абшары У Беларусі ёсьць у наяўнасьці ўсе магчымасьці для разьвіцьця цяжкай і лёгкай прамысловасьці, для росквіту сельскай, лясной і воднай гаспадаркі. А таму, праблему «Вялікага Дняпро» неабходна вырашаць, як праблему ўсесаюзнага значэньня, улічваючы інтарэсы БССР.

Прыступаючы да распрацоўкі праблемы, трэба своячасова паклапаціцца аб стварэньні кадраў інжынэраў і тэхнікаў, арганізаваць адпаведныя гідратэхнічныя лябараторыі. Праверыць праект па мадэлях, вывучыць пытаньні аб перакачцы морскай вады з Балтыцкага мора ў звыш-магістралі раўнамернага жыўленьня.

15 лютага-усесаюзны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў

Заваяваць права на пасылку дэлегатаў

на ўсесаюзны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў можа толькі той калгас, які поўнасьцю засыпаў і ачысьціў насеньне, па-бальшавіцку разгарнуў падрыхтоўку да сяўбы

Два калгасы — два паказьнікі падрыхтоўкі

(Ад нашага кар.)

ЖЛОБІН. Прамова тав. Сталіна аб рабоце на вёсцы і пастанова ЦК і СНК СССР пра абавязковую пастаўку збожжа дзяржаве прапрацаваны на шырокім сходзе калгасьнікаў калгасу «Серп і молат» (Маршальскі сельсавет) сумесна з аднаасобнікамі.

Гэтыя гістарычныя дакументы спатканы калгасьнікамі і працоўнымі ад наасобнікамі з вялікім задавальненьнем.

27 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак падалі заявы аб уступленьні ў калгас, з якіх ужо 17 поўнасьцю абагулілі насенны і страхавы фонд і маемасьць згодна статуту, ужо залічаны ў члены калгасу.

Калгас «Серп і молат» па-баявому рыхтуецца да сустрэчы Усесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

Плян сяўбы на плошчы 132 га поўнасьцю прыняты і абгавораны на праваленьні калгасу, вытворчых брыгадах і на агульным сходзе.

Насенны і страхавы фонды засыпаны поўнасьцю і ўжо ачышчаны на 100 проц. Наладжана ахова насеньня. На гэту справу адказным вылучаны член праўленьня калгасу.

Ужо адрамантавана 21 плуг, 34 бараны і 29 калёс. Збрыя адрамантавана і падрыхтавана поўнасьцю. Забраніраваны фуражны фонд з разьліку па 6 цэнт. сена на каня і дастатковая колькасьць аўса. Узорна ў гэтым калгасе пастаўлены дагляд за канём (ацяленьне стайняў, ачыстка, станкі, вадапой).

Калгас ужо скончыў разьмеркаваньне ўраджаю.

Калгас «Серп і молат» сапраўды пабальшавіцку адказвае на мерапрыемствы партыі і ўраду. Ён зьяўляецца прыкладам для ўсіх астатніх калгасаў 4-га вытворчага вучастка Жлобінскай МТС.

А што робіцца там, дзе няма масавай работы?

Зусім іншы малюнак у другім калгасе гэтага вытворчага вучастку МТС —у калгасе «Чырвоны прамень», Кароткаўскага сельсавету. Тут яшчэ і ня думаюць прапрацоўваць пастанову ЦК і СНК пра абавязковую пастаўку збожжа дзяржаве.

Таму зусім зразумелы прычыны тых ганебных прарываў, якія ёсьць у гэтым калгасе ў справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Плян сяўбы не прапрацаваны вытворчымі брыгадамі і сходам калгасьнікаў. Насенне (аўса, лёну) поўнасьцю не засыпана. 40 проц. насеньня яшчэ не ачышчана. Дрэнны ў калгасе догляд за канём, пануе абязьлічка. Фуражны фонд ня складзены, кармы выдаткоўваюцца бяз усякага ўліку. Рамонт інвэнтара ня скончаны. Разьмеркаваньне ўраджаю не праведзена.

*

Тут камэнтары не патрэбны. Два калгасы на адным вытворчым вучастку: кіраўніцтва аднаго калгасу сапраўды па-бальшавіцку змагаецца за вырашэньне цэнтральнай задачы—павышэньне ўраджайнасьці, мабілізуе актыўнасьць калгасьнікаў вакол мерапрыемстваў партыі і ўраду; кіраўніцтва другога, цягнецца на павадку ў кулака, зрывае важнейшыя мерапрыемствы, разбурае калгас.

Руйнуючым ударам па кулацкім кіраўніцтве калгасу «Чырвоны прамень», ачышчэньнем яго ад клясава-варожых элемэнтаў, сканцэнтраваньнем увагі калгасьнікаў вакол рашэньняў пленуму ЦК і ЦККП—толькі магчыма выцягнуць гэты калгас у рады перадавых.

ЗАКРЭЎСКІ

Там, дзе ўзначалена ініцыятыва мас

У сувязі з ўсесаюзным зьездам калгасьнікаў-ударнікаў калгасы Стара-Вадвянскага сельсавету (Шклоўскі раён) па-ударнаму разгарнулі падрыхтоўчую работу да веснавой сяўбы.

Скончыўшы загатоўкі ўсіх відаў, яны па-баявому ўзяліся за засыпку насенных і страхавых фондаў. У выніку масавай работы, засыпка насенных фондаў па сельсавеце скончана поўнасьцю. Па тэхнічных культурах плян засыпкі насенных фондаў выкананы на 111,5 пр., па збожжавых—на 124,3 проц., па бульбе—128,4 проц.

Увесь засыпаны насенны фонд цалкам ачышчаны.

Шырока разгорнуты рамонт інвэнтара. Калгасы—імя Варашылава, «Зара», «Беларусь»—пабудавалі свае кузьні, дзе рамантуюць інвэнтар. Усюды вылучаны адказныя калгасьнікі за рамонт інвэнтара і захаваньне насенных фондаў.

У час работы па засыпцы насенных фондаў і прапрацоўцы апошніх пастаноў партыі і ўраду арганізавана тры новых калгасы.

Усе гэтыя даягненьні—вынік бальшавіцкай работы Стара-Вадвянскага сельсавету.

У. Стромскі.

За права ўдзелу на зьезьдзе ўдарнікаў

(Ад нашага спэцкора)

БАБРУЙСК. Падрыхтоўка да Усесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў праходзіць ў раёне пад знакам далейшай барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасу. Ва кол падрыхтоўкі да зьезду па калгасах разгарнуўся масавы рух ударнікцтва і спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы. У спаборніцтва ўключаюцца калгас за калгасам. Гэты масавы рух ужо мае поўныя вынікі.

Калгас «Глуша», Рымавецкага сельсавету, поўнасьцю засыпаў і ачысьціў насеньне. Гэты калгас паставіў задачу—да дня адкрыцьця зьезду скончыць рамонт сельска-гаспадарчых машын і інвэнтара, вывезьці палову гною, замацаваць за поўнымі зямельнымі вучасткамі брыгады. Выкананьнем гэтых задач калгас мае на мэце дабіцца права пасылкі свайго дэлегата на зьезд. Гэты-ж калгас вызначыў норму ўраджайнасьці па збожжавых 9,5 цэнт. з га (раённая норма 8,2 цэнт), па бульбе—126 цэнт. з аднаго га.

Разгорнута сацспаборніцтва паміж калгасамі «Праўда» і «Чырвоны каст рычнік», якімі заключаны сацумовы на лепшую падрыхтоўку да сяўбы.

Калектыў Лесакамбінату накіраваў у Бронскі падшэфны сельсавет брыгаду для дапамогі ў рамонце сельска-гаспадарчых машын, інвэнтара, а таксама ў разгортваньні масавай работы вакол зьезду ударнікаў-калгасьнікаў.

Прамова тав. Літвінава на генэральнай канфэрэнцыі па разбраеньні

ЖЭНЕВА, 6-II. (Спэц. кор. ТАСС). Сёньня генэральная камісія канфэрэнцыі па разброеньні працягвала дыскусію аб французскім пляне.

З прамовай, заслуханай з вялікай увагай, выступіў тав. Літвінаў.

ЖЭНЕВА, 6-II. (Спэцкор. ТАСС). «Французская дэлегацыя зьвярнулася да нас з заклікам устрымацца ад агульных, нашэўных заўваг, а выявіць адно сіны кожнай дэлегацыі да французскага пляну. Я ўпаўне спачуваю гэтаму заклику і лічу яго зусім своячасовым. Мы, нажаль, вельмі часта многа абяцаем вывучаць прапановы, якія мы робім, не прыступаючы, аднак, да практычнага іх вывучэньня ці нават абгаварэньня. Канфэрэнцыі прадстаўлена шмат прапаноў, але мы патрацілі цэлы год не на абгаварэньне, а на адкладаньне іх, на рэзэрваваньне да другога выпадку ці на кансэрваваньне ў тэхнічных камісіях. Магу запэўніць французскую дэлегацыю, што савецкая дэлегацыя, якая наогул заўсёды адкрыта і з поўнай шчырасьцю вы ступала тут па ўсіх пастаўленых пытаньнях, і на гэты раз ня ўхіліцца ад дакладнага вызначэньня сваіх адносін. Французская дэлегацыя прасіла даваць ёй «абдуманае адабрэньне» ці «дакладную крытыку» яе прапаноў. Я пастараюся даць ёй і тое і другое. Савецкая дэлегацыя вывучала з глыбокім інтарэсам французкія прапановы, якія мы абгаворваем, і я рады заявіць, што калі ня ўсе, дык некаторыя з іх сустракаюць з яе боку поўнае падтрыманьне. Зусім не жадаючы зьмяншаць іх значэньне, я павінен, аднак, адзначыць, што яны ня маюць уласна ніякіх новых прапаноў у галіне скарачэньня ўзбраеньняў, а калі такія прапановы там ёсьць, дык яны пастаўлены ў строгую залежнасьць ад прыняцьця канфэрэнцыяй французкай схэмы так званай бясьпекі. Інакш кажучы нам прапануюць выпрацаваць спачатку пэўныя прадпасылкі, якія дазволілі-б потым абгаворваць мерапрыемствы па скарачэньні ўзброеньняў. Ня лішнім будзе ўспомніць, што яшчэ на IV сэсіі падрыхтоўчай камісіі французкая дэлегацыя ў асобе цяперашняга міністра замежных спраў Францыі Поль Банкура патрабавала, каб да падрыхтоўкі камісіяй праекту канвэнцыі па разбраеньні, яна за нялася праблемай бясьпекі. Гэта прапанова была падтрымана іншымі дэлегацыямі і ў выніку быў створаны спэцыяльны «камітэт арбітражу і бясьпекі». Гэты камітэт працаваў на працягу двух год, распрацаваў ад прапаноў, пасьля чаго ім было прыступлена да выпрацоўкі праекту канвэнцыі па разбраеньні. Я напамінаю аб гэтым часткова для таго, каб аддаць належную ўвагу пасьлядоўнасьці і настойлівасьці кіраўнікоў французкай палітыкі. Аднак, ці таму, што выпрацаваныя камітэтам прапановы па бясьпецы не задавальняюць зараз французкую дэлегацыю, ці-ж таму, што гэтыя прапановы адхілены іншымі дэлегацыямі, але мы знаходзімся зараз перад тварам новых французкіх прапаноў адносна бясьпекі. Гэта значыць, што пасьля 4-х год работ падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні, на другім годзе існаваньня самой канфэрэнцыі мы аказваемся адкінутымі да таго этапу, на якім знаходзіліся пяць год назад і вымушаны зноў пакінуць у баку пытаньні разбраеньня заняцца праблемай бясьпекі. Будзем спадзявацца, што гэты цыкль не паўторыцца ў наступныя пяць год і мы не апынімся зноў на тым-жа месцы, дзе знаходзімся цяпер.

Свой пункт гледжаньня ў пытаньні бясьпекі савецкая дэлегацыя ня раз выказвала і ў падрыхтоўчай камісіі і на цяперашняй канфэрэнцыі. Савецкая дэлегацыя зусім ня хоча ігнараваць праблему бясьпекі, а наадварот усьвядомліваючы ўсе яе значэньне, яна, аднак, пераконана заўсёды была і пераконана зараз у тым, што найлепшым, калі не адзіным, забясьпечаньнем бясьпекі для ўсіх народаў зьяўляецца поўнае разбраеньне ці хоць-бы максымальнае скарачэньне ўзбраеньняў на працягу кароткага часу. Мы таксама меркавалі і мяркуем, што паза гэтым мэтадам праблема бясьпекі зьяўляецца настолькі складанай, выклікае столькі сур'ёзных палітычных пытаньняў і зьвязаных з ім міжнародных супярэчнасьцяй, што яна наўрад ці можа быць вычарпана разам і ў кароткі час і што заняцца гэтай праблемай значыць адмовіцца ад усіх кло патаў аб разбраеньні на вельмі доўгі пэрыяд.

Але мы, відавочна, ад абгаварэньня гэтай праблемы ўхіліцца ня можам хоць-бы і таму, што яна пастаўлена перад намі вялікай магутнай краінай, якая заяўляе, што да вырашэньня гэтай праблемы яна ня можа прыняць на сябе якія-небудзь абавязацельствы па скарачэньні ўзбраеньняў. Мы вымушаны таму, калі мы не жадаем працягваць хадзіць па кругу, не прасоўваючыся наперад, з усёй сур'ёзнасьцю абгаварыць французкія прапановы і ўстанавіць: або магчыма міжнародная згода на глебе гэтых і іншых прапаноў, якія могуць быць унесены па пытаньні бясьпекі іншымі дэлегацыямі, каб усьлед за тым зноў зьвярнуцца да пытаньня разбраеньня, або-ж згода аказацца немагчымай і тады сказаць сабе, што з прычыны пазіцыі некаторых дзяржаў уся праблема разбраеньня і бясьпекі ў сваёй сукупнасьці не паддасцца вырашэньню, што не шляхам міжнародных канфэрэнцый чалавецтва будзе збаўлена ад няжкага ярма ўзбраеньняў і бічча вайны. Ва ўсякім выпадку пара ўнесьці яснасьць у лёс канфэрэнцыі і спыніць тупацца на адным месцы.

Пераходзячы да істоты французкага мамэрандуму, я павінен адзначыць, што толькі яго першы разьдзел можа адносіцца да ўсіх дзяржаў, тут прадстаўленых. Што да астатніх разьдзелаў,—яны толькі маюць на ўвазе або членаў існуючых міжнародных арганізацый, або членаў маючых нанова ўзьнікнуць добраахвотных аб'яднаньняў. Так, напрыклад, разьдзел другі датычыцца выключна членаў Лігі нацый, разьдзел трэці і часткова пяты—толькі да эўрапэйскіх дзяржаў і трыбунал арганізацыйна зьвязаных з Лігай нацый, разьдзел чацьверты—да ўдзельнікаў вашынгтонскай морской згоды ці міжземаморскіх дзяржаў і таксама гатовых прызнаваць для сябе абавязковымі рашэньні Лігі нацый *). Трэба дапусьціць, што аўтары гэтых разьдзелаў ня мелі на ўвазе ўдзел у мяркуемых імі камбінацыях Савецкага Саюзу, які, як вядома, разьмешчаны ня толькі на эўрапэйскім, але і на азіяцкім матэрыку, членам Лігі нацый не зьяўляецца і да вашынгтонскай згоды ня прыцягваўся.

Мне ўяўляецца бязумоўным, што паколькі на ўдзельнікаў у камбінацыях, як'я намечаюцца, мяркуецца ўскласьці спэцыяльныя вельмі сур'ёзныя абавязацельствы, гэтыя ўдзельнікі маюць права патрабаваць, каб абавязацельствы гэтыя распаўсюджваліся прынам сі на іх бліжэйшых суседзяў. Значыц ца, паколькі з Савецкім Саюзам мяжуюць ня толькі эўрапэйскія, але і азіяцкія дзяржавы, як Японія, Кітай і іншыя, якія з мяркуемых камбінацый загадзя адкідаюцца і значыцца ад іх вызваляюцца, наўрад ці можна чакаць ад Савецкага Саюзу, каб ён прыняў на сябе гэтыя абавязацельствы.

Далей, само выкананьне абавязацельстваў і парадак іх выкананьня падпарадкаваны цалкам рашэньням савету Лігі нацый, што зьяўляецца дадатковым доказам таго, што французкія прапановы ў гэтай частцы не адрасаваны Савецкаму Саюзу.

Па гэтых меркаваньнях савецкая дэлегацыя ня бачыць патрэбы ў сучасны момант разглядаць па-сутнасьці прапановы, якія заключаюцца ў разьдзелах 2-5 французкага мэмарандуму, тым больш, што яна раз ужо выказвалася накрыт некаторых з гэтых прапаноў, як напрыклад, аб інтэрнацыяналізацыі ўзброеных сіл, калі гэтыя прапановы былі зроблены на канфэрэнцыі па разбраеньні тагочасным галавой французкай дэлегацыі панам Тард'е. Савецкая дэлегацыя пакідае, аднак, за сабой права зьвярнуцца да іх, калі часам выявіцца складанасьць да прыняцьця з боку дзяржаў, да якіх яны непасрэдна зьвернуты. Як мною было ўжо ўпамянута, да ўсіх тут прадстаўленых дзяржаў, у тым ліку і да СССР, можна лічыць зьвернутымі французкія прапановы, якія заключаюцца толькі ў першым разьдзеле, што трактуе значнае пашырэньне і тлумачэньне абавязацельстваў, прынятых удзельнікамі пакту Келёга-Брыяна.

Я рады магчымасьці заявіць, што супроць гэтых прапаноў савецкая дэлегацыя пярэчаньняў ня мае і гатова будзе падпісаць канвэнцыю, якая ўцелясьняе іх. Я дазволю сабе толькі некалькі заўваг вельмі, на мой погляд, істотных. Я мяркую, што калі мы ставім сваёй задачай узмацненьне і пашырэньне абавязацельстваў, што выцякаюць з пакту, дык мы павінны адначасова паклапаціцца аб тым, каб ужо прынятыя па ім абавязацельствы захоўвалі сваю поўную моц для ўсіх яго ўдзельнікаў і не абмяжоўваліся, ня ўшчымляліся-б тымі агаворкамі, якія былі зроблены аднабакова некаторымі дзяржавамі, агаворкамі, якія зводзяць амаль на нішто ўвесь пакт. Праўда, гэтыя агаворкі легальнай моцы ня маюць, паколькі астатнія ўдзельнікі пакту на іх згоды не давалі, але ўсё-ж вядомы выпадкі спасыланьняў на іх для апраўданьня агрэсіі. Савецкая дэлегацыя таму прапануе ў патрэбны момант або каб дзяржавы, якія зрабілі агаворкі, фармальна ад іх адмовіліся, або, каб у міжнародным акце было зафіксавана пазбаўленьне гэтых агаворак усякай юры дычнай і маральнай сілы.

Далей, французкія прапановы прадугледжваюць некаторыя міжнародныя санкцыі ў адносінах да дзяржавы, парушаўшай пакт, гэта зн. да дзяржавы, якая акажацца ў якім небудзь узброеным канфлікце нападаючым бокам. А калі так, дык няўхільна ўстае пытаньне аб тым, хто і як вызначыць гэты нападаючы бок. Відочна прыдзецца або падумаць аб стварэньні спэцыяльнага міжнароднага органу для гэтай мэты, або ўскласьці адпаведныя функцыі судзьдзі на канфэрэнцыю з прадстаўнікоў усіх удзельнікаў пакту.

У тым і ў другім выпадку напрошваецца пытаньне аб'ектыўнасьці рашэньня у так жыцьцёвым для той ці іншай дзяржавы пытаньні, як прызнаньне яе нападаючай і прыстасаваньне да яе міжнародных санкцый. Пытаньне гэтае можа цікавіць усе дзяржавы, але мае асобае значэньне для краіны, якую я прадстаўляю, а таму тут асабліва неабходны поўная шчырасьць і ўзаемаразуменьне. Мы прадстаўляем тут адзіную ва ўсім сьвеце дзяржаву, якая зьмяніла ў сябе палітычны лад, стварыўшы зусім новую палітычную сыстэму саветаў, зьнішчыла капіталізм і будуе новую сацыяльную сыстэму — сацыялізм, у той час, як усе астатнія дзяржавы захавалі ў сябе капіталістычны лад. Вам вядома, паны, што ўзьнікненьне новай Савецкай сацыялістычнай дзяржавы было настолькі няпрыемным капіталістычнаму сьвету, што ён у свой час спрабаваў нават шляхам інтэрвэнцыі зноў устанавіць у краіне ранейшы капіталістычны лад, або хоць-бы шляхам разьдзяленьня зьменшыць аб'ём гэтай дзяржавы. Гэтыя спробы не ўдаліся і больш не аднаўляліся. Але нельга сьцьвярджаць, што думкі аб новых спробах гэтага роду зусім пакінуты. Мы знаем наадварот, што ў многіх краінах з гэтымі думкамі працягваюць насіцца вельмі ўплывовыя палітычныя дзеячы, лідэры вялікіх партый, учарашнія, і заўтрашнія, і нават сёньнешнія члены ўрадаў, якія амаль не цэнтрам сваёй зьнешняй палітыкі хацелі-б зрабіць паход на Савецкі Саюз і з гэтай мэтаю ўжо цяпер падтрымліваюць цесную арганізацыйную і фінансавую сувязь з эмігрантамі—прыхільнікамі зьвергнутага ладу.

Прыходзіцца прызнаць, што капіталістычны сьвет у цэлым яшчэ не прымірыўся канчаткова з фактам існаваньня краіны, якая будуе сацыялізм, і гэтая непрымірымасьць працягвае на раджаць непрыязьнь да гэтай краіны, якая (непрыязьнь) знаходзіць самыя розныя шляхі для свайго выражэньня. Я не стану ўтамляць вашую ўвагу пераліччэньнем ўсіх тых анты-савецкіх кампаній самага рознаякаснага характару, якія адраджаюцца з году ў год. Досыць сказаць, што калі ўлічыць усе існуючыя дзяржавы абедзьвюх паўкуляў, дык большасьць з іх да гэтага часу не ўстанавіла нармальных адносін з Савецкім Саюзам, іншымі словамі, прыстасоўвае да яго байкот, адну з тых самых санкцый, якія мяркуецца прыстасоўваць у будучыні толькі да нападаючага боку. Пры такіх ўмовах дазвольна спытаць—ці можа Савецкі Саюз чакаць справядлівых да сябе адносін і аб'ектыўных рашэньняў ад якога-небудзь міжнароднага органу, які будзе складацца выключна з варожага яму капіталістычнага сьвету і, магчыма, у большасьці сваёй з прадстаўнікоў урадаў краін, якія яго байкатуюць. Мне здаецца, што двух адказаў на гэтае пытаньне ня можа быць, а калі хто небудзь у гэтых адносінах сумневаецца, дык я рэкамендаваў-бы яму зусім гіпатачна ўявіць сябе на хвіліну, што становішча Савецкага Саюзу—яго уласная дзяржава ў якасьці адзінай капіталістычнай краіны сярод ўсіх іншых краін, якія ўстанавілі савецкі лад і будуюць сацыялізм, і адказаць, ці згадзілася-б яго краіна давяраць вырашэньне жыцьцёвых пытаньняў, якія яе датычаць, міжнароднаму органу, які апрача яе складаўся-б выключна з прадстаўнікоў урадаў Савецкіх краін.

Досыць удумацца ў гэтае, каб зразумець, чаму Савецкі Саюз—пакуль існуюць ўказаныя мною адносіны да яго—ня можа згаджацца прызнаваць для сябе абавязковымі рашэньні такіх міжнародных арганізацый, як пленум або савет Лігі Нацый, існуючыя міжнародныя трыбуналы, арбітражныя суды, хаця ён у прынцыпе зусім не адхіляе ні міжнароднага супрацоўніцтва, ні арбітражу. Гэтае шляханьне няўхільна ўстае для яго з асаблівай вастратой кожны раз, калі заходзіць гутарка аб стварэньні міжнародных органаў з судовымі, кантрольнымі і да т. п. функцыямі. Натуральна, што ён у такіх выпадках павінен патрабаваць такога складу гэтых органаў, які гарантаваў-бы яму тую-ж меру аб'ектыўнасьці і справедлівасьці, якая забясьпечана капіталістычным дзяржавам. І гэтае патрабаваньне савецкая дэлегацыя павінна будзе высунуць калі на чаргу стане пытаньне аб адпаведных міжнародных органах у сувязі з французкімі прапановамі.

Але і пры любым складзе міжнародны орган, якому прышлося-б вы рашаць нападаючы бок, адчуваў-бы пры сучасных умовах надзвычайныя затрудненьні хоць-бы па той простай прычыне, што ня толькі ня існуе агульна - прызнанага паняцьця агрэсіі, а наадварот, існуе на гэты конт рознагалосьце і ня толькі ў тэорыі, але і на практыцы. Гэта даказваецца, між іншым, і тымі агаворкамі, якія былі зроблены пры падпісаньні пакту Келёга-Брыяна. У чым сэнс гэтых агаворак? У тым, што, адмаўляючыся ад нападу, тая ці іншая дзяржава заяўляе, што яна пакідае за сабой свабоду дзеяньняў-паўпрэкі пакту—для некаторых выпадкаў або для некаторых раёнаў зямное кулі.

А якавы гэтыя выпадкі або раёны—гэтая дзяржава будзе вызначаць сама. Пытаньне, якія ёсьць гарантыі, што такімі выпадкамі ня будуць прызнаны тыя самыя ўмовы, якімі да гэтага часу апраўдваліся войны. Мы знаем з вопыту мінулага, што апраўданьнем агрэсіі служылі шматлікія і вельмі рознастайныя акалічнасьці, як напрыклад: імкненьне да эксплёатацыі натуральных багацьцяў якой небудзь тэрыторыі, парушэньне якой небудзь міжнароднай згоды, мерапрыемствы якой небудзь дзяржавы, якія закранаюць матар'яльныя інтарэсы другой дзяржавы, абарона уласных грамадзян, якія дабравольна паехалі на ўласную рызыку і страх у якую небудзь другую краіну, парушэньне раней набытых прывілей якой небудзь дзяржавай, узьнікненьне рэвалюцыі ці непарадкаў у якой небудзь краіне і г. д. Падобныя апраўданьні нападу мелі месца не ў сярэднія вякі, ня ў мінулы стагодзьдзях, а ў самы апошні час. Гэтая практыка абагацілася новымі тэорыямі. Зараз існуе тэндэнцыя апраўдваць напад сапраўдным або уяўным унутраным хаотычным становішчам другой дзяржавы. Разьмерамі капіталаўкладаньняў або наогул асаблівымі інтарэсамі ў чужой дзяржаве, адмаўленьнем характару дзяржавы за той ці іншай краінай, стратэгічнымі меркаваньнямі, жаданьнем прасунуць лінію уласнай абароны далёка за межы ўласнай дзяржавы. Існуе і тэорыя апраўданьня вайны неабходнасьцю забесьпячэньня міру. Калі падобныя тэорыі атрымаюць пашырэньне і будуць улічвацца міжнароднымі судзьдзямі, г. зн. членамі адпаведнага міжнароднага трыбуналу, дык можна з упэўненасьцю загадзя сказаць, што ні пры адным узброеным канфлікце не акажацца нападаючага, што будуць узаемнападаючыя або узаемаабараняючыяся бакі, або, што яшчэ горш, краіна, якая абараняецца, будзе прызнавацца нападаючай і наадварот.

Вы знаеце, паны, што нават трыбуналы, якія дзейнічаць на аснове дакладных законаў, не заўсёды выносяць правільныя рашэньні. Гэта даказваецца тым, што па адной і той-жа справе розныя судовыя інстанцыі, якія дзейнічаюць на аснове аднолькавых законаў, выносяць неаднолькавыя рашэньні. Тым менш можна чакаць ад трыбуналу правільных рашэньняў, калі яны не абавязаны кіравацца ніякімі законамі і ніякімі дырэктыўнымі лініямі. Але ў такім іменна становішчы можа апынуцца міжнародны орган, які павінен будзе прыняць пакт Кэлёга-Брыяна. Але-ж справа ідзе ў даным выпадку аб інтарэсах не паасобных грамадзян, а цэлых дзяржаў і народаў.

Зусім відавочна, што калі мы хочам бачыць пакт Кэлёга-Брыяна з тымі дадаткамі, якія прапануе савецкая дэлегацыя ў дзеяньні і забясьпечыць міжнароднаму органу, які гэтыя дадаткі павінен выклікаць да жыцьця, хоць-бы мінімум аўтарытэту, аб'ектыўнасьці і давер'я, дык мы павінны даць яму кіруючыя ўказаньні і для гэтага перш за ўсё вызначыць, што такое вайна, і што такое агрэсія, у чым яе розьніца ад самаабароны і раз назаўсёды асудзіць тыя ўяўныя апраўданьні агрэсіі, якія нам вядомы з мінулага. Толькі, што разьвітыя мною думкі савецкая дэлегацыя паспрабавала ажыцьцявіць у праекце дэклярацыі, які яна дазваляе сабе прадставіць на ваше абгаварэньне».

Тав. Літвінаў за гэтым аб'яўляе наступны тэкст праекту дэклярацыі:

«Лічачы неабходным у інтарэсах забясьпечаньня усеагульнай бясьпекі і аблягчэньня дасягненьня згоды аб максымальным скарочаньні ўзбраеньняў—вызначыць магчыма больш сьцісла паняцьце агрэсіі для ўхіленьня прычын да яе апраўданьня, выходячы з прынцыпу роўнага права ўсіх дзяржаў на незалежнасьць, бясьпеку і самаабарону.

Натхнёная імкненьнем у інтарэсах усеагульнага міру забясьпечыць кожнаму народу права свабодна разьвівацца ім самым выбраным шляхам і ім-жа ўстаноўленымі тэмпамі і для гэтага поўнасьцю за хаваць бясьпеку, незалежнасьць і поўную недатыкальнасьць яго тэрыторыі і яго свабоды самаабароны ад нападу або ўзарваньня зьне, але выключна ў межах уласных граніц.

Лічачы неабходным даць кіруючыя ўказаньні міжнародным органам, якія маюць вызначыць нападаючы бок, генэральная камісія аб'яўляе:

1. Нападаючым бокам у міжнародным канфлікце будзе лічыцца дзяржава, якая зрабіла першай адно з наступных дзеяньняў:

а) якая аб'явіла вайну другой дзяржаве;

б) узброеныя сілы якой хоць-бы і без аб'яўленьня вайны ўварваліся на тэрыторыю другой дзяржавы;

в) сухапутныя, морскія або паветраныя сілы якой абстралялі тэрыторыю другой дзяржавы або сьвядома атакавалі яе морскія ці паветраныя судны;

г) сухапутныя, морскія або паветраныя сілы якой былі высаджаны або ўведзены ў межы іншай дзяржавы без дазволу ўраду апошняй або парушылі ўмовы такога дазволу, у прыватнасьці ў адносінах часу або пашырэньня раёнаў прабываньня;

д) устанавіла морскую блёкаду берагоў або партоў другой дзяржавы.

2. Ніякія меркаваньні палітычнага, стратэгічнага і эканамічнага парадку, ні імкненьне да эксплёатацыі на тэрыторыі атакаванай дзяржавы натуральных багацьцяў ці да атрыманьня ўсякага роду іншых выгод або прывілей, ні спасыланьне на значныя разьмеры ўкладзенага капіталу ці на іншыя асаблівыя інтарэсы ў той або іншай краіне, ні адмаўленьне за ёй прымет яе дзяржаўнай арганізацыі—ня могуць служыць апраўданьнем нападу, прадугледжанага пунктам 1-м.

У прыватнасьці, ня могуць служыць апраўданьнем нападу:

А) унутраное становішча якой-небудзь дзяржавы, як напрыклад:

а) палітычна - эканамічная або культурная адсталасьць якога-небудзь народу;

б) уяўныя недахопы адміністрацыі;

в) магчымая небясьпека жыцьцю або маемасьці чужаземцаў;

г) рэвалюцыйны або контррэвалюцыйны рух, грамадзянская вайна, непарадкі або забастоўкі;

д) устанаўленьне або ўзкаваньне ў якой-небудзь дзяржаве таго ці іншага палітычнага, эканамічнага або сацыяльнага рэжыму;

Б) ніякія дзеяньні, законы і распараджэньні якой-небудзь дзяржавы, як напрыклад:

а) парушэньне міжнародных дагавораў;

б) парушэньне гандлёвых, канцэсыйных або іншых эканамічных правоў і інтарэсаў дзяржавы або яе грамадзян;

в) разрыў дыплёматычных або эканамічных адносін;

г) эканамічны або фінансавы байкот;

д) адмаўленьне ад платы даўгоў;

е) недапушчэньне або абмежаваньне эміграцыі ці зьмена рэжыму чужаземцаў;

ж) парушэньне прывілей афіцыйных прадстаўнікоў іншай дзяржавы;

з) адмаўленьне ў пропуску ўзброеных сіл на тэрыторыю трэцяй дзяржавы;

і) рэлігійныя або антырэлігійныя мерапрыемствы;

к) пагранічныя інцыдэнты.

3. У выпадку абвяшчэньня якой-небудзь дзяржавай мабілізацыі або згрупаваньня ёю значных сіл недалёка ад граніц, дзяржава, якой такія дзеяньні пагражаюць, мае права ўжыць дыплёматычныя або іншыя спосабы вырашэньня міжнародных спрэчак. Яна можа тым часам таксама ўжыць у адказ меры ваеннага характару, аналёгічныя адзначаным вышэй, ня ўрываючыся, аднак, у чужую тэрыторыю.

Генэральная камісія пастанаўляе ажыцьцявіць вышэй паданыя прынцыпы ў канвэнцыі па бясьпецы і разбраеньні, якая мае быць заключана, або ў асобную згоду, якая складзе неадымную частку вышэй адзначанай канвэнцыі».

Далей тав. Літвінаў заяўляе:

«Пры прадстаўленьні гэтага дакументу мне зусім ня былі невядомыя тыя дыскусіі, якія мелі месца ў Лізе нацый і тыя затрудненьні, якія сустрэліся пры спробах вызначэньня агрэсыўных дзеяньняў. Таму я магу прадбачыць усе тыя пярэчаньні і заўвагі, якія будуць зроблены з прычыны нашага дакументу экспэртамі і юрыстамі, якія зноў будуць указваць на немагчымасьць абсалютна дакладнага вызначэньня агрэсіі і на магчымасьць выпадкаў, якія намі не прадугледжаны, а галоўнае на труднасьць устанаўленьня першага вінавайцы нападу пры эпрупаваньні ўзброеных сіл па абодвы бакі якой-небудзь граніцы. На гэта я магу зараз-жа адказаць: да абсалютна дакладных азначэньняў мы ня імкнуліся, бо такія наўрад-ці магчымы і мысьлімы, а галоўнае, што ў вялікай большасьці, калі не ва ўсіх вядомых нам з гісторыі выпадкаў узброеных канфліктаў, устанаўленьне такіх фактаў, які першы бок абвясьціў вайну або першы выканаў фактычны акт агрэсіі—ніякіх труднасьцяй не складала і спрачацца—даводзілася толькі аб тым, наколькі законныя тыя прычыны і апраўданьні, якімі гэтыя агрэсіі прыкрываліся. Я думаю, што тое-ж самае можна сказаць і ў адносінах выпадкаў, якімі за апошнія гады даводзілася займацца ў Лізе нацый.

Я прызнаю аднак, што і сама савецкая дэлегацыя значна большае значэньне надае 2-му пункту прапанаванай ёй дэклярацыі, дзе даецца разгорнутае абгаварэньне вядомых з гісторыі і магчымых у будучыні выпадкаў апраўданьня агрэсіі, чым астатнім пунктам. Я ня ўпэўнены, што мы ў прачытаным намі праекце дэклярацыі вычарпалі ўсе мыслімыя апраўданьні вайны. Ды мы і ня ставілі сабе такой мэты. Калі мы гаворым, што ніякія меркаваньні ня могуць апраўдаць нападу па чужыя землі, мы гэтым ахапляем і выпадкі, не пералічаныя асобна ў дэклярацыі. Мы гатовы дапусьціць недасканаласьць дакументу, які мы вам прапануем. Мы гатовы выслухаць вашы пярэчаньні, уносіць і прымаць папраўкі, дадаткі і г. д. Але справа не ў дэталях, а ў прыняцьці асноўных прынцыпаў, якія ляжаць у основе гэтага дакументу. Гэтыя прынцыпы складаюцца з абвяшчэньня недатыкальнасьці ўстаноўленых і прызнаных граніц любой дзяржавы вялікай або малой, у адмаўленьні за другімі дзяржавамі права ўмяшаньня ў яе справы, яе разьв'цьцё яе законадаўства і адміністраваньне.

Гутарка ідзе аб тым, каб абвясьціць на міжнароднай канфэрэнцыі «Хартыю правоў народаў». Толькі тады на будуць асаблівае значэньне міжнародныя акты аб адмаўленьні ад вайны, аб ненападзе і яны сапраўды дадуць усім дзяржавам некаторае адчуваньне бясьпекі. Я гавару—некаторае адчуваньне таму, што мы працягваем сьцьвярджаць, што поўная бясьпека для ўсіх можа быць забясьпечана толькі поўным або максымальным разбраеньнем.

Але пакуль і паколькі гэта не ажыцьцёўлена, мы імкнемся так званай праблеме бясьпекі даць такія рашэньні, якія не маглі-б стаць прадметам дыплёматычнай гульні, не маглі-б быць выкарыстаны ня толькі большымі і моцнымі, але і малымі і слабымі краінамі.

Як вы разумееце, паны, нашы прапановы не канкуруюць з французкімі і не замяняюць іх, а зьяўляюцца іх лёгічным працягам. Вось чаму я меркаваў-бы пажаданым іх абгаварэньне пры дыскусаваньні французкіх прапаноў.

Выносячы на міжнародную арэну свае новыя прапановы, савецкі ўрад натхнёны выключна тым-жа імкненьнем, якое прымусіла яго ў свой час прапанаваць поўнае і ўсеагульнае разбраеньне і якое прымушае яго адвесьці такое вялікае месца ў сваёй зьнешняй палітыцы сыстэме двухбаковых пактаў аб ненападзе—імкненьнем да максымальнага забясьпечаньня ўсеагульнага міру. Міралюб'е прадстаўляемага мною ўраду больш здаецца ня выклікае ніякіх сумненьняў.

Некаторыя скептыкі і цынікі імкнуцца, праўда, аслабіць значэньне гэтага міралюб'я ўказаньнем на тое, што савецкая дзяржава адчувае патрэбу ў міру для выкананьня свайго будаўніцтва.

Мы гэтага не адмаўляем, але ці хочуць гэтыя людзі сказаць, што толькі савецкая дзяржава можа будаваць і разьвівацца ва ўмовах міру і што для разьвіцьця капіталістычных дзяржаў патрэбны іншыя ўмовы, ня ўмовы міру? Калі-б іншыя дзяржавы, даючы доказы свайго міралюб'я, растлумачылі, што яны для свайго разьвіцьця адчуваюць патрэбу ў міры, дык мы са свайго боку, з-за гэтага папроку ім не раблі-б. Мы сваімі прапановамі аб разбраеньні і аб пактах ненападу давалі кожнай прадстаўленай тут дзяржаве магчымасьць сказаць гэта, даем ім гэтую магчымасьць і сёньнешнімі новымі прапановамі».

---

*) Пэрны разьдзел французкага пляну, на які спасылаецца ў сваёй прамове тав. Літвінаў, выкладае наступныя асноўныя прынцыпы пляну:

1. Усякая вайна, пачатая ў парушэньне пакту Келёга, разглядаецца, як парушэньне абавязацельстваў у адносінах да дзяржаў.

2. У выпадку парушэньня або пагрозы парушэньня пакту Келёга дзяржавы павінны самым тэрміновым чынам дагаварыцца аб неабходных мерапрыемствах.

3. Усякія непасрэдныя або ўкосныя эканамічныя і фінансавыя адносіны да нападаючых дзяржаў забараняюцца.

4. Дзяржавы абавязуюцца не прызнаваць ніякага здарыўшагася факту, які зьяўляецца вынікам парушэньня міжнародных абавязацельстваў.

Другі разьдзел выкладае асновы праектуемай эўрапэйскай арганізацыі для забясьпечаньня бясьпекі кожнай з прадстаўленых у ёй дзяржаў, пры гэтым падкрэсьліваецца, што сфэра дзеяньняў гэтай арганізацыі абмяжоўваецца толькі Эўропай, і ўказваецца на неабходнасьць эфэктыўнага і лёяльнага ўжыцьця арт. 16 Статуту Лігі нацый (аб санкцыях нападаючага боку).

Трэці разьдзел устанаўлае, што пытаньне аб аказаньні дапамогі ў рамках эўрапэйскай арганізацыі краіне, якая падлягае нападу, будзе вырашацца саветам Лігі нацый шляхам непасрэднага канстатаваньня факту нападу на даную краіну. У тым-жа разьдзеле выкладаюцца ваенныя артыкулы, якія маюць на мэце выдзяліць паасобныя часткі нацыянальных сіл кожнай краіны для правядзеньня самых тэрміновых сумесных дзеяньняў, што выцякаюць з 8 і 16 арт. арт. Статуту Лігі нацый.

4-ты разьдзел прысьвечаны пытаньню аб морскім узброеньні. Ён указвае на вашынгтонскую згоду 1922 году і раіць заключэньне іншых рэгіянальных дагавораў перш за ўсё міжземаморскага.

Гэтыя дагаворы павінны забясьпечыць скарачэньне тэнажу і супрацоўніцтва флётаў пры аказаньні дапамогі краіне, якая падлягла нападу.

Пяты разьдзел прапануе стварыць у кожнай краіне спэцыялізаваныя авіяцыйныя сілы, якія павінны быць перададзены Лізе нацый для правядзеньня ў тэрміновым парадку неабходных дзеяньняў супроць нападаючай краіны. Пры гэтым зазначаецца, што Ліга нацый павінна мець у распараджэньні прынамсі ў Эўропе магутную зброю з мэтаю забясьпечыць захаваньне міжнародных абавязацельстваў. Забарона паветранай бамбардыроўкі павінна быць удакладнена асобымі пастановамі. Апроч таго, павінна быць заключана спэцыяльная згода, на якой кіраўніцтва і кантроль над паветранымі сіламі ў Эўропе будуць перададзены міжнароднаму органу.

Барацьба за фінплян

Ісьці ў нагу з перадавымі

Прыняць жорсткія фінансавыя рэпрэсіі да раёнаў, якія ня выконваюць фінплян

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР аб ходзе выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў першага кварталу

Ход выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў першага кварталу ў студзені месяцы (27,1 проц. агульнага падсканага пляну і 16,6 проц. па добраахвотных плацяжох) азначае, што большасьць гарадзкіх і раённых фінансавых аддзелаў БССР не зразумелі важнасьці першага кварталу ў выкананьні фінансавага пляну і ўсяго году, недаацанілі значэньня выкананьня пляну добраахвотных плацяжоў, як галоўнага вучастку пляну першага кварталу.

Толькі некаторыя раёны, як Сеньненскі, Заслаўскі, Лагойскі, Тураўскі, Чачэрскі, Лепельскі, Крупскі, Бярэзінскі, Лёзьненскі і інш. выканалі за студзень месяц звыш 50 проц. квартальнага заданьня. З асаблівым здавальненьнем Наркамфін БССР азначае выкананьне квартальнага пляну Брагінскім райфа на 119,3 проц., у тым ліку па добраахвотных плацяжох на 95,7 проц.

Прызнаць недапушчальным адставаньне ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў, дапушчанае раёнамі—Прапойскім, Мазырскім, Бабруйскім, Шклоўскім, Плешчаніцкім, Уваравіцкім, Ельскім, Вушацкім, Буда-Кашалеўскім, Мсьціслаўскім, Магілеўскім і Полацкім, якія выканалі за студзень месяц менш 25 проц. квартальнага пляну.

Асабліва адзначыць выключную слабасьць работы ў студзені месяцы фінансава-крэдытных органаў і апарату ашчадкас буйнейшых гарадоў—Менску, Віцебску і Гомелю, якія з перадавых пазіцый скаціліся ў студзені ў апошнія рады адстаючых раёнаў.

Прапанаваць загадчыкам усіх гарфа, і райфа асабліва адстаючых, неадкладна на мабілізаваць увесь фінансава-крэдытны апарат і дамагчыся мабілізацыі ўвагі ўсёй савецкай грамадзкасьці гарадоў і раёнаў вакол справы ўзмацненьня работы па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў першага кварталу.

Папярэдзіць загадчыкаў райфа Прапойскага, Мазырскага, Бабруйскага, Шклоўскага, Плешчаніцкага, Уваравіцкага, Ельскага, Вушацкага, Буда-Кашалеўскага, Мсьціслаўскага, Магілеўскага, Полацкага і загадчыкаў гарфа—Менскага тав. Елінеўскага, Віцебскага—тав. Адама, Гомельскага—тав. Карпмана аб іх пэрсанальнай адказнасьці за неадкладную ліквідацыю адпушчаных у студзені прарываў.

Папярэдзіць загадчыкаў фінансавых аддзелаў адстаючых гарадоў і раёнаў, што пры адсутнасьці належнага перадому ў справе мабілізацыі сродкаў да 20 лютага Наркамфінам будуць прыняты жорсткія меры па скарачэньні водпуску грашовых сродкаў гэтым раёнам, як тым, якія не забясьпечваюць нармальнага выкананьня фінансавага пляну ўжо з самага пачатку 1933 году.

Народны Камісар Фінансаў БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Зводка ходу выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва на 1 лютага 1933 г.

Перадавыя раёны па выкананьні фінпляну

| Назва раёнаў | Проц. вык. агульнага пляну | Проц. вык. па добраахвотн. плацяжох | Назва раёнаў | Проц. вык. агульнага пляну | Про

НА ІОЛЬКІ ЗАСЫПАЦЬ—неабходна арганізаваць пільную ахову насеньня на складах

Кулацкаму шкодніцтву-руйнуючы удар; калгасная ўласнасьць сьвяшчэнна і недатыкальна

Кулакі і іх агенты разбазарваюць насеньне

(Ад нашага спэцкора)

ГАРАДОК. Па Гарадоцкім раёне на 7 лютага ў насенныя фонды ссыпаны: зярнёвых на 74,6, лёнасемя—на 56,8 проц., бульбы—74,1 проц.

Прарыў зьявіўся ў выніку таго, што раённыя арганізацыі, большасьць сельсаветаў, ячэек і ўпаўнаважаныя ня здолелі спалучыць дзяржаўныя загатоўкі з засыпкай насенных і страхавых фондаў.

Райзт, абавязкам якога зьяўляецца сыстэматычнае кіраўніцтва падрыхтоўкай да сяўбы, яшчэ і да гэтага часу не давёў пасеўных плянаў да калгасаў і вёсак. Калгас пры стварэньні насенных фондаў кіруецца леташнімі плянамі.

За гэтыя прарывы ў падрыхтоўцы да сяўбы хватаецца кулак і накіроўвае ўсю сваю сілу на тое, каб сарваць засыпку насенных фондаў і гэтым падарваць падрыхтоўку да вясновай сяўбы.

Тактыка кулака па сутнасьці справы ня новая. Гэта стаўка на распальваньне дробна-ўласьніцкіх інстынктаў адсталай часткі калгасьнікаў, беднякоў і серадняко- аднаасобнікаў.

Пралезшыя ў калгасы кулакі і іх падпявалы разбазарваюць насеньне.

Вось некалькі прыкладаў.

У калгасах «Калініна» і «Граніт» (Першамайскага сельсавету) яшчэ не прыступілі да засыпкі ў насенфонд лёну і зярнёвых. Значная частка насеньня па ініцыятыве кулацкага праўленьня разбазарана і расьцягнута.

Патрэбны энэргічныя меры каб засьпечыць насеньнем калгас «Серп і Молат» (Качанскага сельсавету). Чыстка калгасу ад выяўленых кулакоў ускорыла, што ў калгасе «Серп і Молат» насеньня аўса, лёну і інш. культур разбазарана.

У калгасе «Калініна» (Хвашчанскага с-с) старшыня калгасу **Дарошчанка** разбазарыў насенныя фонды, зярнёвых і бульбу.

У раёне ёсьць усе ўмовы для поўнага забясьпечаньня насеньнем яравога кліну, як па лініі калгасаў, так і ад наасобнага сэктару.

Рад перадавых калгасаў ужо цалкам стварыў насенныя і страхавыя фонды, скончыў ачыстку і прыступіў да практычнай падрыхтоўкі да сяўбы.

Калгас «Чырвоны партызан» (Першамайскі сельсавет) поўнасьцю засыпаў насенны матар'ял па зярнёвых і тэхнічных культурах і бульбе. Скончыў ачыстку насеньня і пераключыўся на падрыхтоўку да сяўбы цэлы рад іншых калгасаў раёну.

У барацьбе за насеньне Гарадоцкі раён вельмі адстаў. Бальшавіцкім абавязкам усёй партарганізацыі зьяўляецца у самыя бліжэйшыя дні поўнасьцю скончыць ссыпку насеньня, ачысьціць яго і забясьпечыць хаваньне.

Ня меншай увагі, чым калгасы, патрабуе аднаасобны сэктар. Гэтага нельга забываць. Нельга забываць і таго, што пасыпяховае стварэньне насенных і страхавых фондаў зьяўляецца неадлучнай часткай барацьбы за пасьпяховую падрыхтоўку да вясеньняй пасеўкампаніі. Неабходны пералом забясьпечыць толькі самая рашучая барацьба з кулацтвам і яго агентурай, са спажывецкімі тэндэнцыямі адсталых пластоў калгасьнікаў.

Пільна захоўваць насенную бульбу

Буда-Кашалёва. (Ад нашага спэцкора). У раёне выяўлен рад фактаў замярзаньня і псаваньня насеннай бульбы ў капцох. Так, у калгасе «Гром» Буда-Кашалёўскага сельсавету, з прычыны недагляду замерзла і пачала псавацца бульба ў 6 капцох.

Зусім ня было догляду за бульбай у калгасе «Новае жыцьцё», Ліпеніцкага сельсавету. У гэтым калгасе сьвіньні падрылі капец бульбы. Так падрытым і заізімаваў гэты капец. Зразумела, што бульба замерзла і пачала гніць.

Чатыры капцы бульбы змарожаны ў калгасе «Перамога», Забаскага сельсавету.

Звыш 16 цнт насеннай бульбы згніло у калгасе «Чырвоная Беларусь» Буда-Кашалёўскага сельсавету.

Прыведзеныя факты-сыгналы патрэбуюць высокай пільнасьці ў захаваньні насеннай і калгаснай бульбы. Яны клічуць прыцягнуць да суровай адказнасьці тых, хто вінаваты ў псаваньні насеннай бульбы.

Усякі, хто зьяўляецца вінаўнікам за мерзаньня насеннай бульбы павінен разглядацца, як кулацкі дапаможчык, як эрыўшчык весьнавой сяўбы першага году другой пяцігодкі.

Павінны быць ужыты безадкладна меры ў адносінах тых капцоў, у якіх бульба прымерзла і пачала псавацца каб ачысьціць капцы ад загніўшай бульбы. Аграномы павінны даць парады, як гэта трэба лепш зрабіць.

Усе капцы трэба ўцяпліць, абкласьці іх лапкамі, бульбоўнікам або гноем.

Ул. Дуброўскі.

КААПГАСЫ ТАБАРАМ ВАНДРУЮЦЬ...

Прафсаюзныя і каапэрацыйныя арганізацыі БССР «узмоцнена» рыхтуюца да гародняй сяўбы. Ідзе дзейная выпрацоўка, распрацоўка і прапрацоўка рэзалюцый, абежнікаў і дырэктыў. Паперкі розных разьмераў ляцяць густым роем і тоўстым пластом асядаюць на сталох загадчыкаў каапгасамі. Паперкі ня толькі розныя па разьмерах, але і розныя па зьместу. Хвала алаху, гаспадароў зараз у каапгасаў ня мала: сельгаскіраўніцтва—раз, заводакіраўніцтва—два, ЗРК—тры, прафсавет—чатыры, гарсавет—пяць і г. д. І ў кожнага гаспадара па дзьве рукі да па дзьве нагі: і часта правая рука ня ведае, што робіць левая, а чаго часам хоча левая нага, тое разыходзіцца са здаровым сэнсам.

Была, напрыклад, жорсткая дырэктыва ЦСПСБ—ДА ПЕРШАГА СТУДЗЕНЯ скончыць разьмяжаваньне і перадачу каапгасаў прадпрыемствам. Але-ж, куды там! Яшчэ Козьма Прутковы сказаў: «ніхто не ахопіць неабдымнага». А апэтыты ва ўсіх зараз сапраўды неабдымныя. Ёсьць у Віцебску буйны трэставны каапгас «Новы сьвет». Рашылі перадаць каапгас прадпрыемствам. Прэтэндэнтаў шмат і ўсе салідныя: у кожнага дзьве—тры тысячы рабочых, вялікая ўдзельная вага, адказны вучастак—экспарт, шырпажыў і г. д. У адпаведнасьці са здаровым сэнсам, Белкапсаюз парашыў перадаць гаспадарку двум прадпрыемствам: шчотачнаму камбінату і акулярнай фабрыцы. Пытаньне было ўзгоднена, увязана, зацьверджана ўсімі зацікаўленымі арганізацыямі. Гэта было 20 сьнежня.

22 дні сядзеў Віцебскі Гарсавет над гэтай пастановай і... высядзеў новую. Так нарадзіўся варыянт № 2. Гаспадарку «Новы сьвет» разьбіць на тры часткі; адну—акулярнай фабрыцы, другую—скурзаводу, трэцюю—пад самадзейныя гароды.

Гэта было 12 студзеня. 23 студзеня з Віцебску было атрымана паведамленьне, што Гарсавет адмяніў свой уласны варыянт № 2 і склаў новенькі—№3: да трох прэтэндэнтаў дадаць махорачную фабрыку і яшчэ сяго-таго. Але 2-га лютага прыехаў у Менск дырэктар Бесьдзкага шчотачнага камбінату і паведаміў, што і варыянт № 3 адхілён і што Гарсавет зьвярнуўся да перша-пачатковага праекту—падзяліць гаспадарку паміж двума прадпрыемствамі: шчотачным камбінатам і акулярнай фабрыкай. Такім чынам, калі гэта пастанова канчатковая, згублена ЗВЫШ ПАЛУТОРА МЕСЯЦА на пустыя размовы і складаньне праектаў рэзалюцый.

Той-жа мэтад ужыты Віцебскім Гарсаветам у адносінах да другой буйнай гаспадаркі «Янаполь». У гаспадарцы 900 га зямлі, 330 галоў буйнай рагатай жывёлы, 90 коняй, рад пабудоў. Драбіць такую гаспадарку—сьмерці падобна. Гэта ўсяроўна, што жывога чалавека разрэзаць на кавалкі і патра баваць ад кожнай часткі цела прадукцыйнай работы. Ня гледзячы на ўсю абсурднасьць драбленьня такой гаспадаркі, парашылі зямлю і цяглавую сілу падзяліць паміж трыма прадпрыемствамі, і кароўнікі разам з каровамі, але БЕЗ КАРМОВАЙ БАЗЫ перадаць ЦРК. Пабудовы гаспадаркі «Янаполь» ацэньваюцца ў поўмільёна рублёў. Яны больш ці менш задавальняюць патрэбы гаспадаркі, як АДЗІНАГА ЦЭЛАГА. Калі-ж яго раздрабіць на чатыры часткі, дык новым гаспадаром патрэбна будзе ЯШЧЭ ПОЎМІЛЬЁНА РУБЛЁЎ, каб пабудаваць самыя неабходныя ім пабудовы.

Ці-ж можна дапусьціць такую безгаспадарчасьць. Ясна, што не. З такой тэндэнцыяй трэба змагацца. Хто-ж павінен змагацца? Пажадана было-б, каб супроць гэтай тэндэнцыі выступілі ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ прадстаўнікі самай масавай пралетарскай арганізацыі—работнікі Віцебскага Гарпрафсавету, у прыватнасьці яго старшыня тав. РАЗУМАЎ. На жаль, апошні ніяк ня можа гэтым заняцца. Барацьба з тэндэнцыяй нездаровага драбленьня гаспадарак нясумяшчальна з ганаровай роляю АРБІТРА па дзяльбе каапгаскай маёмасьцю, якую (ролю гэту самую) выконвае старшыня Гарпрафсавету тав. Разумаў.

І калі ўжо ідзе дзяльба, дык чым горш за іншых загадчык Віцебскага Гарэа тав. ЗАЛЕСКІ. Нічым ня горш—і ён прапануе Гарпрафсавету перадаць адзін з дамоў каапгасу «Новы сьвет» Плодагародніне.

Старшыня Барысаўскага Гарпрафсавету тав. РЫКЛІН не зьяўляецца арбітрам па дзяльбе каапгаскай маёмасьці. Але гэта не перашкаджае яму стаяць у старонцы і спакойна чытаць «вумныя» пастановы Барысаўскага РВК аб дзяльбе Барысаўскай фэрмы ЦРК. Пры чым, калі гуце імя Домбаля вылучаецца з гэтай фэрмы 70 га зямлі, у тым ліку 20 га няўдобнай (пяскі, горы) замест 200 га, згодна пастановы кіруючых арганізацый, дык КАЛГАСУ «Маяк сацыялізму» адрэзваецца ад фэрмы ЦРК 30 га лепшай зямлі на той падставе, што гэты вучастак некалі «належаў» калгасу.

Гомельскія арганізацыі таксама ніяк ня могуць рашыцца... прыняць канчатковае рашэньне аб перадачы каапгасу. Гомельскі гарком КП(б)Б 12 сьнежня ў прысутнасьці прадстаўніка Белкапсаюзу разьмеркаваў каапгасы паміж прадпрыемствамі. Здавалася, справа скончана. Як раз праз месяц гарсавет прыняў рашэньне аб перазьмеркаваньні каапгасаў і байка пра белага бычка пачата зноў. Такі-ж малюнак у Рэчыцы, адкуль 31-га студзеня атрымана маланка аб тым, што вакол перадачы каапгасаў яшчэ ідуць спрэчкі.

Вось такімі «стройнымі радамі» пад маршам траскучых рэзалюцый аб поўным забясьпечаньні рабочых гароднінай, ідуць да сяўбы арганізацыі БССР. Вынікі? Вельмі сумныя. На 28 студзеня заданьне па вывазцы ўгнаеньняў выканана на 22 проц. замест 50. Па асобных гарадох справа яшчэ горш: па Віцебску і Гомелі—12 проц., па Мазыры і Шклове—7 проц. Віцебская акулярная фабрыка, з якой Віцебскі гарсавет гуляе, як кошка з мышкай, то даючы, то адбіраючы вучастак зямлі каапгасу «Новы сьвет», вывезла 400 тон гною—35 проц. усяго заданьня і... на гэтым паставіла кропку—да канчатковага вырашэньня лёсу сваёй гаспадаркі.

Ні ў адным горадзе сур'ёзна не ўзяліся за збор попелу і іншых відаў угнаеньняў. ЦК КП(бБ) гэтымі днямі прапанаваў усім прадпрыемствам і ўстановам, што маюць гной, вывезьці яго на палі каапгасаў УЛАСНЫМ ТРАНСПАРТАМ. Але гэта дырэктыва яшчэ ня выконваецца. Прафсаюзам няма часу прасачыць за выкананьнем гэтай дырэктывы, няма часу дапамагчы, бо яны вельмі заняты дзяльбой.

З 37.000 парніковых рам палова патрабуе рамонту. Аднак, большасьць каапгасаў рамонту не пачалі. Многім каапгасам не хапае шкла. Між іншым, сельгаскіраўніцтва пры БКС атрымала ад Белдзяржснабу тры вагоны шкла. Калі-ж работнікі сельгаскіраўніцтва адкрылі вагоны і праверылі скрынкі, аказалася, што шкло вельмі добрай якасьці, БЭМСКАЕ, а 9 скрынак—шкло вітрыннае, таўшчынёю 6—7 мм. Зразумела, што такое шкло ня можа быць скарыстана для парніковых рам.

Надзвычай слаба праходзіць рамонт с.-г. інвэнтара і трактароў.

Дрэнна з фінансаваньнем. Наркамлегпром атрымаў для фінансаваньня сваіх каапгасаў паўтара мільёна рублёў, але ня ведае, як разьвярстаць гэтую суму, бо не пасьпеў выявіць сапраўднай патрэбнасьці гаспадарак у гросах. Пытаньне аб фінансаваньні прадпрыемстваў Наркамцяжпрому яшчэ ня вырашана. Між тым рад прадпрыемстваў атрымаў не каапгаркі, а ПУСТУЮ ЗЯМЛЮ і ім патрэбна салідная фінансавая дапамога.

Насеньнем ня ўсе гаспадаркі забясьпечаны. Не хапае звыш 2200 тон раньняй бульбы і 600 тон насеньня па кармавых культурах. Белкапсаюз пакуль нічога не зрабіў для пакрыцьця гэтага дэфіцыту. У той-жа час ёсьць рад фактаў разбазарваньня бульбы («Новы сьвет» — Менск, «Усход» — «Новы Шлях» — Магілёў, «Білева» — Віцебск).

У пачатку гэтай заметкі мы ўспамянулі пра «левую нагу» некаторых кіраўнікоў. Пра гэтую «левую нагу» варта расказаць больш падрабязна.

Каапгасу «Новы шлях», які належыць Віцебскай швэйнай фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі», патрэбна да зарэзу вывезьці гной. На 30 студзеня з 1900 тон было вывезена толькі 150. Але фабком і партком фабрыкі замест дапамогі КААПГАСУ (у мінулым годзе з-за недахопу транспарту згубілася 35 га розных культур) патрабуюць ад дырэктара каапгасу тав. Воранава пад страхам пакараньня прадстаўленьня транспарту ДЛЯ ІНШЫХ ПЕРАВОЗАК, НЯ ЗЬВЯЗАНЫХ З КААПГАСАМ.

Такую-ж лінію — на абслугоўваньне СВАІХ ПАТРЭБ КААПГАСКІМ ТРАНСПАРТАМ — гнуць і кіраўнікі Віцебскага шчаціннага камбінату.

Распараджэньне сельгаскіраўніцтва Белкапсаюзу аб перадачы з каапгасу «Новы сьвет» у каапгас «Білева» двух тон вотрубаў у сувязі з поўнай адсутнасьцю ў «Білева» кармоў, было Віцебскім гарсаветам адменена, у выніку ў «Білева» ПРЫРЭЗАНА 140 СЬВІНЕЙ.

Некаторыя ЗРК таксама карыстаюцца «перакодным» момантам і прысваіваюць грошы каапгасаў. Так, ЗРК Магілёўскай фабрыкі імя Валадарскага прысвоіў 40 тысяч рублёў каапгасу «Новы шлях», ЗРК Добрускай папяровай фабрыкі — 85 тысяч рублёў, ЗРК Віцебскага заводу «Чырвоны Мэталіст» — 25 тысяч рублёў.

Вандроўнае жыцьцё, якое вядуць многія каапгасы БССР з лёгкага дазволу, а ў некаторых выпадках пры непасрэдным удзеле ПРАФАРГАНІЗАЦЫЙ, дае сябе адчуваць на ўсіх вучастках падрыхтоўкі да сяўбы.

Трэба рашуча ўдарыць па кіраўніцтве вышэйпералічаных раённых арганізацый і спыніць зьдзекі з рашэньняў партыі і ўраду.

Р. Б.

Конюх-ударнік т. КАЗЮКОЎ (калгас імя «XII Кастрычніка») прэміяваны за добры догляд коней (чыста ў канюшні, рацыянальнае скарыстаньне кармоў і подсьцілу).

Зьбірайце попел

Попел зьяўляецца вельмі каштоўным угнаеньнем, асабліва для сенажа цяй. Па-першае, попел зьмяжае кіслотнасьць глебы, па другое растварае азотныя угнаеньні. Пад уплывам попелу павялічваецца травастой бабовых расьлін, зьмяншаецца колькасьць асаковых і інш. кіслых траў.

Дрывяны попел мае ў сваім саставе галоўным чынам фосфарную кислату, калі і вапну.

Як-жа мы адносімся да гэтай спажыўнай матэрыі? Па барбарску, безгаспадарча выкідаем на сьмецьнік, у нямыйныя ямы вялізарную колькасьць каштоўнага ўгнаеньня. Гэтым самым мы недаатрымліваем сотні і тысячы пудоў" ураджаю. Па арганізаваных падліках навукова-дасьледчых устаноў, з 100 пачэй за зімовы перыяд можна атрымаць 600 клг. калійнага ўгнаеньня, 2000 клг. вапны і 300 з лішнім клг. фосфарнай кіслаты.

Усе прадпрыемствы, установы і арганізацыі павінны неадкладна арганізаваць зьбіраньне і хаваньне попелу. Попел трэба хаваць ў скрынках з на крыўкамі, каб туды не папаў сьнег, або вада. Бо ад гэтага попел вышча лачваецца, губляе свае спажыўныя рэчы. Да кожнага жакту і прадпрыемства павінны быць прымацаваны пэўныя саўгасы і калгасы. Кожны месяц гаспадаркі павінны вывозіць попел.

Зьбіраньне попелу дасьць дзяржаве тысячы і нават сотні тысяч дадатковых пудоў добрай якасьці сена і іншых сельска-гаспадарчых культур.

Касьянаў.

За бальшавіцкую пільнасьць, за партыйнасьць у навуцы

Загад па Народным Камісарыяце Асьветы БССР

1. У новых праграмах для масавае школы, асабліва па так званым, «гуманітарным цыклі» (гісторыя, грамадазнаўства, літаратура, мова і геаграфія) дапушчаны рад грубых палітычных памылак і навуковых недакладнасьцяй, выяўленых пры распрацоўцы праграм на настаўніцкіх калфэрэнцыях і пасобнымі работнікамі Культпропу ЦК КП(б)Б і НКАсьветы.

2. Суаўтарамі праграмы па гісторыі дакласавага грамадзтва і антычнага сьвету паказаны праф. Нікольскі і праф. Перцаў, тым часам як праф. Нікольскі нязкага ўдзелу ў складаньні гэтае праграмы ня прымаў, а праект праграмы, прадстаўлены праф. Перцавым быў карэнным чынам пераапрацаваны і зьменены прэзыдыумам ДВС без узгадненьня з аўтарам.

Адзначаючы ўсё гэта, як адсутнасьць дастатковай бальшавіцкай клясавай пільнасьці і бальшавіцкага змаганьня за партыйнасьць у навуцы як з боку Прэзыдыуму ДВС, Навукова-Дасьледчага Інстытуту Камуністычнага Выхаваньня, так і пасобных работнікоў сэкцыі ДВС,—абвяшчаю:

1. Рэдактару зборніка праграм, кансультанту ДВС—тав. Манаву, кіраўніку Школьнай сэкцыі ДВС—тав. Баршчэўскай і Нам. дырэктара НДІ Ком. Выхаваньня—тав. Дардаку—суровую вымову.

2. Прапаную тт. Баршчэўскай і Манаву безадкладна арганізаваць перагляд праграм, вылучыўшы, па ўзгадненьні з адпаведнымі арганізацыямі брыгады з найбольш палітычна-вытрыманых і кваліфікаваных працаўнікоў.

Працу па перагляду праграм закончыць не пазьней 9-й г. г.

3. Пытаньне аб кіраўнікох брыгад і аўтарох праграм, дапусьціўшых грубыя палітычныя памылкі, паставіць дадаткова перад ЦКК РСІ БССР.

4. Загад апублікаваць у друку.

Наркамасьветы БССР ПЛАТУН.

Кулакі Няк расавы і іх агенты

(Ад нашага карэспандэнта)

Адставаньне лёназагатовак па Асьвейскім раёне яшчэ не ліквідавана. Кулацкі сабатаж, васьмечанасьць калгасу і сельсаветаў анты-савецкімі элементамі, прытуленьне клясавай пільнасьці з боку партыйных ячэек—такавы тыя прычыны, якія прывялі раён да глыбокага прарыву. Засьмечанасьць партячэек клясава-варожымі элементамі паносілі ўдар за ўдарам па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў; рад «камуністаў», якія стаялі на чале сельскіх саветаў адкрыта выконвалі сацыяльны заказ клясавага ворага. І гэта рабілася ня раптам, не выпадкова, а сьвядома, рабілася на працягу гадоў.

Бярэм факты. Перад намі справа трох братоў, трох кулацкіх «сокалоў», —Няк расавых. Першы брат Няк расаў доўга стаяў на чале Кісялёўскага сельсавету, другі—на чале Сухараўскага сельсавету, і трэці, малодшы «браціка» Няк расавых-сакратар камсамольскай ячэйкі. Сам бацька Няк расаў, цікавы сапай «мірна урос» ў калгас.

Хто такія Няк расавы, дзе «цьвілі» што рабілі яны да Кастрычніцкай рэвалюцыі?

Бацька Няк расаў былы турэмны дазорца, тыпавы кулак. Каб схаваць да раскулачваньня ёй пралез ў калгас, сыны у партыю ды камсамол. Адсюль пад маскай калгасьнікаў, пад прыкрыцьцём партыйных білетаў, кулакі Няк расавы усёй сям'ёю палезьлі на ад казныя пасады. Стаўшы на чале сельсавету першы Няк расаў—«старшыня» Кісялёўскага сельсавету, пачаў даводзіць цьвёрдыя заданьні да беднякоў і серадняко, укрываць зямлю і маёмасьць кулакоў дапамагаў ім пралазіць у калгасы. Характарную палітыку вёў Няк расаў па лініі загатовак. Ён заўсёды імкнуўся даказаць, што «па Кісялёўскім сельсавеце нічога не зробіш, бо тут, што ні вёска-суцэльная контр-рэвалюцыя, плян загатовак ўсёроўна не выканаюць».

У сапраўднасьці-ж вёскі па Кісялёўскім сельсавеце такія-ж як і па другіх сельсаветах, раёнах, рэспубліках. Ёсьць людзі нашыя, аддаючыя савецкай уладзе, іх пераважная большасьць ў вёсцы, ёсьць, зразумела людзі варожыя нам,—кулакі і іх агенты. Варта было разагнаць кулацкую зграю, як вёскі Кісялёўскага сельсавету пераста лі быць «контр-рэвалюцыйнымі» і сельсавет стаў выходзіць на перадавыя пазіцыі па загатоўках.

Тое-ж самае можна сказаць і пра Сухараўкаўскі сельсавет на чале якога стаяў другі кулак Няк расаў. Контр-рэвалюцыйная дзейнасьць гэтага «кіраўніка»—падобна да дзейнасьці першага.

Раскрыем другі «букет» кулацкіх кветак. На чале калгасу «На варце Ленінскага Шляху» Сенькаўскага сельсавету, фармальна стаяў Чабатароў. Чабатароў старшыня калгасу, член КП(б)Б. Фактычна-кіраваў калгасам «паляводаў» Скардэль—былы царскі прыдворны, заўзяты контррэвалюцыянэр. Будучы «паляводам» Скардэль сьвядома пасадзіў бульбу і пасеяў другія культуры на дрэннай глебе. На пратэсты калгасьнікаў ён клясарамон на адказаў: «нічога хлопцы, нам абы толькі пасеяць, а наконт ураджайнасьці няхай другія думаюць». Скардэль згнаіў лён, змарозіў тысячы пудоў бульбы «заскірдаваў» жыта так, што яно ушчэнт пагніло.

Клясавы вораг Скардэль дзейнічаў хітра. Ён лоўка абводзіў вакол пальца «камуніста» Чабатарова, страціўшы клясавую пільнасьць Чабатароў ішоў на паваду у Скардэля.

Які вынік? Вынік цяжкі. Калгас паніёс убытку на 60.000 руб., г. зн. ў сярэднім па 2000 руб. на кожную калгасную сям'ю. Дорага абайшлося калгасу змыканьне Чабатарова з клясавым ворагам.

Паданыя тут факты далёка яшчэ ня поўны. Засьмечанасьць калгасаў, кіраўніцтва сельсаветаў і саміх партячэек клясава-варожым элементам мае месца амаль у кожным сельсавеце Асьвейшчыны. Трэба падкрэсьліць, што клясавы вораг разгортваў сваю шкодную дзейнасьць ня толькі на фронце загатовак. Кулак ня менш упарта супраціўляўся ў час сяўбы і ўборкі. У часе ўборачнай кампаніі клясавы вораг на Асьвейшчыне многа запісаў у актыў балянсу свайго шкодніцтва, якое ў асноўным выразілася ў арганізацыі вялікіх страт ураджаю, краж і іншага шкодніцтва. Вядома, што кулак расьпіразвецца асабліва там і тады, дзе згублена клясавая пільнасьць, дзе ён не сустракае арганізаванага руйнуючага адпору, дзе кулака лічаць «бяскрыўдным чалавекам».

Пералічаныя тут факты ўскрылі нядаўна. «Героі»—перададны пралетарскаму суду, ад якога мы чакаем самай жорсткай кары.

Партарганізацыя Асьвейшчыны павінна зрабіць адпаведныя вывады і ў першую чаргу выправіць палітычныя памылкі, дапушчаныя ў час правядзеньня загатовак.

На аснове бязьлітаснай барацьбы з кулацкім сабатажам, рашучага ачышчэньня партарганізацыі ад кулацкіх агентаў, па бальшавіцку выпраўляючы свае памылкі партарганізацыі Асьвейшчыны абавязаны поўнасьцю завяршыць лёназагатоўкі, своячасова падрыхтаваць і па ўдарнаму правесьці веснавую сяўбу.

І. Ш.

Ход засыпкі насенфондаў па калгасах БССР

	Зярнёвыя	Лён	Каноплі	Бульба
На 7-ІІ 1933 г.	91,4	71,9	83,7	92,1

Ленін і сацыялістычны плян

Даклад тав. СТЭЦКАГА на жалобным паседжаньні ў Вялікім тэатры, прысьвечаным дзевятай гадаві е са дня сьмерці Ў. І. Леніна, 21 студзеня 1933 году*)

IV. Неабходнасьць далейшага замацаваньня пралетарскай дыктатуры

Таварышы, мы жывем у сучасны момант у новай абстаноўцы. Сацыялістычны сэктар пераважае і грае рашаючую ролю ў эканоміцы. І ў нас знаходзяцца людзі, якія занадта сьпяшаюцца, якія забываюць указань ні Леніна з гэтага факту абстаноўкі, якая зьмянілася, робяць вывад у карысьць таго, што мы можам аслабіць нашу пралетарскую дзяржаву, што ў вёсцы, дзе арганізаваны калгасы, ўжо няма патрэбы ў саветах і савецкай уладзе.

Усе гэтыя разважаньні карэнным чынам разыходзяцца з усім тым, чаму вучыў Уладзімір Ільліч Ленін па пытаньні аб дзяржаўнай уладзе, што вам у сучасны момант асабліва трэба памятаць. Уладзімір Ільліч заўсёды падкрэсьліваў, што пасьля заваёвы улады пралетарыятам надыходзіць вышэйшая жорсткасьць клясавай барацьбы. Ён так і гаварыў аб вышэйшай жорсткасьці клясавай барацьбы ў сваім канспэкце брашуры аб «Дыктатуры пралетарыяту».

Уладзімір Ільліч таварыў і адносна таго, што пасьля заваёвы дыктатуры пралетарыяту мы маем надзвычайную рознастайнасьць форм клясавай барацьбы. Клясавы вораг зьмяняе сваю тактыку ў залежнасьці ад умоў і мы, таварышы, нагадалі гэта на ўсім працягу рэвалюцыі. Мы мелі і сабатаж, і змовы, і адкрытыя выступленьні вайсковых армій ды інтэрвэнцыі, мы мелі шкодніцтва ў нашых арганізацыях, мы мелі кулацкі сабатаж збожжазагатовак. І ў сучасны момант калі сацыялізм грунтуецца на моцным, нязрушным фундаманце,—клясавы вораг усё яшчэ працягвае сваю барацьбу супроць нашай партыі, супроць справы сацыялістычнага будаўніцтва, клясавы вораг, які страціў сваю эканамічную моц, выбіты з сваіх кулацкіх гнёзд, выбіты з сваіх гандлёвых і спэкуляцкіх «прадпрыемстваў», параспаўзаўся цэлер па розных шчылінах, запаўзае ў нашы ўсе гаковы і імкнецца там пакасьціць, запаўзае ў нашы калгасы і саўгасы з мэтай іх раскласьці, з мэтай супроць паставіць іх савецкай дзяржаве.

Усё гэта ставіць перад намі з усёй вострасьцю пытаньне аб тым, каб заўсёды павышаць нашу пільнасьць, своячасова падмячаць усе махінацыі клясавага ворага, які прыкрываецца савецкай легальнасьцю, які выступае з сябе прыхільніка калгасу для таго, каб туды пралезьці і там, чапляючыся за дробнаўласьніцкія перажыткі калгасьнікаў учарашніх аднаасобнікаў, змагацца супроць савецкай улады, супроць сацыялістычнага будаўніцтва.

Тав. Сталін у сваёй прамове адносна работы на вёсцы паставіў пытаньне такім чынам, што нэўтральных калгасаў у нас ня можа быць, што калгас павінен быць пад нашым кіраўніцтвам, інакш ён нямінуча трапіць пад кіраўніцтва ворага. Некаторыя таварышы сталі ўтупік перад гэтай пастаноўкай, мак тым гэта адзіная правільная ленінская пастаноўка. Усе помнім барацьбу Леніна з эканамістымі ў 1900 годзе. Гутарка тады ішла адносна таго рабочага руху, гутарка ішла адносна таго, быць ці ня быць нашай партыі, ці пашана гэтая партыя ўначальваць рабочы рух. І тады Ленін гаварыў,—адмаўленьне ад палітычнай барацьбы, ад палітычных задач, ад прапаганды і ад рэвалюцыйнай партыі абазначае падпарадкаваньне рабочага руху буржуазнаму ўплыву і буржуазнай ідэалёгіі. Так ставілася пытаньне адносна рабочае клясы. З такой вострасьцю ставіў яго Уладзімір Ільліч адносна перадавой рэвалюцыйнай клясы, адносна таго, што яна можа падпасьці пад буржуазны ўплыў. А ў нас мы маем калгасьніка дробнага ўласьніка, які адно-адно гаравіў з сваёй індывідуальнай гаспадаркай, які яшчэ мае рад перажыткаў. І зусім натуральна, што ў адносінах да іх гэтае пытаньне стаіць яшчэ з большай вострасьцю. Хто кіруе ў калгасах? Ці кіруюць бальшавікі? Калі кіруюць не бальшавікі, калі там няма сапраўднага канкрэтнага бальшавіцкага кіраўніцтва, гэта кіраўніцтва пападае ў рукі нашых ворагаў.

Таму, таварышы, у даны час перад намі з усёй выразнасьцю стаіць пытаньне аб неабходнасьці далейшага замацаваньня пралетарскай дыктатуры для барацьбы з рэшткамі клясавага ворага.

Разам з тым перад намі разгортваецца ўсё мацней другі важны бок пралетарскай дыктатуры—гэта яе выхаваўчая роля. Адзін з важнейшых задач пралетарскай дыктатуры Ленін лічыў яе выхаваўчыя задачы і ў адносінах да адсталых слаёў пралетарыяту і ў адносінах да іншых адсталых слаёў працоўных. Вось гэтая задача стаіць перад намі з усёй сілай.

Партыя пралетарскай дыктатуры ў сучасны момант гэту задачу, задачу стварэньня новай грамадзкай дысцыпліны, якую Ленін разглядаў, як новы від грамадзкай сувязі, выконвае і ў нашых калгасах, у гэтых новых прадпрыемствах, якія зьяўляюцца вялізарнейшым дасягненьнем пяцігодкі, але якія разам з тым нам неабходна ў сучасны момант умацаваць, каб зрабіць усе гэтыя прадпрыемствы сацыялістычнымі па сутнасьці.

І, нарэшце, таварышы, у адносінах калгасаў, і ня толькі ў адносінах калгасаў, перад намі стаіць і другая важная задача, якую Ленін заўсёды падкрэсьліваў. Ён гаварыў:

«Камунізм пачынаецца там, дзе зьяўляюцца самыя адданыя, перамагаючыя цяжкую працу, клопаты радавых рабочых аб павялічэньні прадукцыйнасьці працы, аб захове кожнага пуда хлеба, вугалю, жалеза, і іншых прадуктаў, якія дастаюцца не працуючым асабіста і ня іх «бліжнім», а «дальнім», т. е. усяму грамадзтву ў цэлым дзесяткам і сотням мільёнаў людзей, аб'яднаных спачатку ў адну сацыялістычную дзяржаву, потым у Саюз Савецкіх Рэспублік» (Ленін, «Вялікі пачын», том XXIУ, стар. 322).

Вось як Ленін ставіў гэтае пытаньне—клопаты аб кожным кавалку хлеба, аб кожным кавалку вугалю ў інтарэсах усяго сацыялістычнага грамадзтва. Гэта і ёсьць, таварышы, тое пытаньне, аб ахове сацыялістычнай уласнасьці, якое ў апошні час было пастаўлена нашай партыяй і якое мае вялізарнае значэньне, бо гэта сацыялістычная ўласнасьць зьяўляецца асновай савецкага ладу. Партыя вядзе ў калгасах выхаваўчую работу, дамагаючыся таго, каб яны зразумелі, што гэта за грамадзкая ўласнасьць, навучыліся яе захоўваць, навучыліся аб ёй клапаціцца. Гэта значыць,—выхаваньне калгасьнікаў, як работнікаў, як членаў сацыялістычнага грамадзтва, як сапраўды сацыялістычных работнікаў.

V. Аб рэвалюцыйнай тэорыі

Набліжаецца дзень, калі мы будзем адзначаць 50 год са дня сьмерці Маркса. Тут, на сёнешнім паседжаньні нам трэба сказаць, што асновай нашых перамог зьявілася тая акалічнасьць, што наша партыя ўвабрала ў сябе праз Леніна ўвесь вопыт міжнароднага рэвалюцыйнага руху, усё лепшае, што ў ім было. Бо тав. Ленін быў ня толькі знаўцам марксызму, ён быў вялізарнейшым марксыцкім тэарэтыкам, ён быў прадаўжальнікам Маркса ў разьвіцьці рэвалюцыйнай тэорыі.

Тав. СТАЛІН зусім правільна характарызаваў ленінізм як марксызм эпохі імпэрыялізму і пралетарскай рэвалюцыі. Гэта падкрэсьлівае тое, што ленінізм зьяўляецца арганічным працягваньнем і разьвіцьцём марксызму.

Тав. СТАЛІН у сваёй путарцы з амэрыканскай рабочай дэлегацыяй ўпяршыню даў выразнае і кароткае ўяўленьне аб тых пытаньнях, аб тых пунктах, якія распрацоўваў Ленін у разьвіцьці вучэньня Маркса; пытаньні пралетарскай дыктатуры; аб савецкай ня форме і пытаньні аб саюзніках пралетарскай рэвалюцыі; аб перамозе сацыялізму ў адзінай краіне, пытаньні нацыянальна-калёніяльных рэвалюцый, аб партыі.

Я ня буду падрабязна спыняцца на гэтым баку, бо ён надзвычай добра выкладзены тав. СТАЛІНЫМ.

Ленін быў ня толькі тэарэтыкам, ён быў практыкам рэвалюцыйнага руху, а марксызм—гэта такое вучэньне, якое не стаіць на месцы, але якое разьвіваецца ў сувязі з практычнай рэвалюцыйнага руху.

Вазьмеце яго работы аб імпэрыялізьме, адносна тактыкі і стратэгіі ў буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, тактыкі і стратэгіі пралетарскай рэвалюцыі. Усё гэта—буйнейшыя прабле мы, якія высунуў і распрацаваў Уладзімір Ільліч Ленін у сувязі з рэвалюцыйным рухам, у сувязі з той барацьбой, якую вя

Па справе б. сакратара Крычаўскага РК КП(б)Б т. Рындзіча

Пастанова прэзыдыуму і парткалегіі ЦКК КП(б)Б ад 2-II 33 г.

Заслухаўшы паведамленьне ўпаўнаважаных ЦК КП(б)Б па загатоўках тав. Л. ГУРЭВІЧА і КУРЦІКА, а таксама тлумачэньне тав. РЫНДЗІЧА, Прэзыдыум і Парткалегія ЦКК КП(б)Б лічаць устаноўленым:

1. З боку тав. РЫНДЗІЧА—был. сакратара Крычаўскага РК КП(б)Б і б. члена ЦК КП(б)Б былі яўна апартуністычныя адносіны да такой важнейшай палітычнай кампаніі, якой зьяўляецца правядзеньне загатовак.

Тав. Рындзіч праявіў простае ігнараваньне і наплявацельскія адносіны да пастаноў сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б і рашэньняў бюро ЦК і сваімі паводзінамі складаў у партый най арганізацыі дэмабілізацыйныя, бяздушныя настроі, спадзяючыся на апартуністычны самацёк, і праявіўшы як у справе націску на кулацка-заможную частку, так і ў справе ачысткі калгасаў ад чужых элемэнтаў—гнілы лібэралізм.

2. Замест поўнага і безагаворачнага прызнаньня палітычнай сутнасьці дапушчаных ім грубейшых палітычных памылак, тав. Рындзіч на паседжаньні пашыранага бюро Крычаўскага РК КП(б)Б зрабіў простую спробу змазаць палітычнае значэньне пастановы ЦК, адмовіўшыся, пасьля свайго зьняцьця, выехаць у адзін з сельсаветаў па загатоўках.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і Парткалегія ЦКК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

Лічыць, што за апартуністычныя адносіны да правядзеньня работы па загатоўках, простае ігнараваньне дырэктыў партыі, гніла-лібэральныя адносіны да кулацкага сабатажу і нежаданьне своячасова па-бальшавіцку пракрытыкаваць, дапушчаныя ім грубейшыя палітычныя памылкі, т. Рындзіч заслугоўвае выключэньня з радоў партыі. Прымаючы пад увагу, што т. Рындзіч зараз прызнае і асуджае свае памылкі і абяцае выправіць іх на практычнай рабоце, улічваючы, што т. Рындзіч да гэтага ня прыцягваўся да партыйнай адказнасьці і зараз ужо зьняты з работы сакратара райкому і выведзен са складу пленуму ЦК КП(б)Б, з мэтай праверкі тав. Рындзіча, як камуніста на далейшай практычнай рабоце, лічыць магчымым застаўленьне яго ў партыі, абвясьціўшы суровую вымову і паслаўшы на вызначную работу.

Пастанову апублікаваць у друку.

Старшыня ЦКК КП(б)Б ЛЫЧОЎ.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б СУХАНАВА.

Пракурор, куплены кулаком

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Загатоўкі збожжа і лёнавалакна ў Буда-Кашалёўскім раёне праходзілі з большымі труднасьцямі, чым у радзе іншых раёнаў БССР. Кулацкі сабатаж у гэтым раёне даваў сябе адчуваць асабліва моцна.

У чым прычына?

Засьмечанасьць кулацкімі, клясававярожымі элемэнтамі калгасаў, сельсаветаў, партыйных і камсамольскіх ячэек у раёне значная. Кулак меў сваю агентуру ў раённых арганізацыях. Нават у Райвыканкоме. У райкоме партыі. У раённай кантрольнай камісіі.

Партыйная арганізацыя, параўнальна маладая. Бальшавіцкая пільнасьць выхавана слаба. У паасобных ячэйках, у многіх членаў і кандыдатаў партыі бальшавіцкая пільнасьць амаль поўнасьцю адсутнічае.

Крытыка і самакрытыка ў партарганізацыі не разгорнута. Няма ленінскай непрымірымасьці да ўсяго, што перашкаджае ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі ў практычнай рабоце.

У радзе зьвеньняў ёсьць зажым крытыкі і самакрытыкі. Асабліва па лініі калгаснай сыстэмы.

Мае месца адарванасьць раду раённых арганізацый ад сельсаветаў і калгасаў. Падамо некалькі фактаў.

Калгас **«Чырвоная Беларусь»** знаходзіцца ў самым раённым цэнтры. На вачох усіх раённых арганізацый. Сем'я паасобных раённых работнікаў знаходзяцца ў калгасе. У склад калгаснай ячэйкі ўваходзяць раённыя кіруючыя работнікі, раённы актыў. Нарэшце, раённыя работнікі «працуцьвяюцца» у гэты калгас за малаком.

Здавалася-б ёсьць усё неабходнае, каб добра ведаць гэты калгас. Ведаць, як сваіх пяць пальцаў. На гэтым калгасе правяраць сваю работу на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, правяраць канкрэтнасьць кіраўніцтва, зрабіць гэты калгас узорам для ўсіх калгасаў раёну.

На справе-ж усе глядзелі па паверхні калгасу. Пісалі запіскі аб падачы каня. Хадзілі за малаком. А той-сей скарыстаў калгас у мэтах самазабясьпечаньня.

Калгас расставаў. На вачох усіх расставаў ад «ціхай сапы» кулака. У калгасе знайшлі, сабе цёплы прытулак ня толькі кулакі, але памешчыкі і попы.

Былая памешчыца Гарашчэня-рахункавод калгасу. Эвангелісцкі «бацюшка»—старшыня калгасу.

— Без эвангельля Зайцаў кроку ня ступіць... Вось, як характарызуе бедная та старшыню калгасу.

Маёмасьць калгасу раскрадаецца і зьнішчаецца. Паасобныя беднякі выйшлі з калгасу.

Ніхто ня бачыў гэтых агідных спраў. Ніхто не заглянуў у глыбіню, у нутро калгасу.

Памешчыкі, кулакі, эвангелісты да таго абнаглелі, што задумалі правесьці чыстку калгасу... ад беднаты.

Зямельна-калгасная частка РВК паказала сваю поўную адарванасьць ад калгасаў.

Драмала і раённая газэта **«Ленінскі Шлях»**. Абломавым з рэдакцыі цяжка было ступіць некалькі крокаў, каб дайсьці да калгасу. Каб зьдзьмухнуць пыл з насьценгазэты і зрабіць яе трыбунай калгасьніка-ударніка. Каб адтачыць па бальшавіцку, самую моцную, самую бойструю зброю партыі і накіраваць яе ўдары супроць клясавага ворага.

Адзіны толькі раённы пракурор часта хадзіў у калгас... За бульбай. За збожжам. За малаком...

Але Мажэйка сам прыносіў з калгасу толькі малако. **Бульбу і збожжа яму прывозілі.**

Эвангеліст Зайцаў, памешчыца Гарашчэня, кулакі з праўленьня калгасу бяз спрэчак адаслалі на кватэру пракурора 40 пудоў бульбы, 80 кілё ячменю. Не забыліся яны між іншым правесьці й адпаведнай «работкі» сярод калгасьнікаў.

Раённы пракурор апынуўся у руках клясавага ворага.

— Пракурор—куплены кулаком—такую клічку далі беднякі калгасьнікі Мажэйку.

Ацэнка зусім правільная. Мажэйка не знайшоў ніводнага кулака, які зьні шчае калгасную маёмасьць. А іх у калгасе—колькі хочаш!

Кулакі высунулі, як «зьлейшага ворага калгаснай маёмасьці»—бедняцку жонку рабочага, якой Мажэйка даў 10 год.

Кулаком не ўдалося «вычысьціць» беднату з калгасу. Беднякі калгасьнік выкрыў кулацкі манэўр. Зараз беднота выкідае з калгасу памешчыкаў і кулакоў, анты-савецкія элемэнты.

Аб тым, на якім узроўні пільнасьць партыйных ячэек, што знаходзяцца ў раённым цэнтры, на якім узроўні пільнасьць камуністых гэтых ячэек; аб тым на якім узроўні крытыка і самакрытыка — гавораць наступныя факты.

Сын махравага кулака—Лісейчыкаў Гаўрыла некалькі год працаваў у райкоме партыі ў якасьці кіраўніка справу. У апошні час ён быў сакратаром РВК, членам прэзыдыуму РВК і зразумела, членам партыі.

Гэта яго бацька ў калгасе «Чырвоная Беларусь». Гаўрыла Лісейчыкаў ведаў становішча калгасу... Але не выкрываў, не выкрываў таму, што гэта азначала выкрыць бацьку!

Праз яго рукі праходзілі допісы рабселькораў, якія патрабавалі рэагаваньня—і па РК і па РВК. Гэтыя допісы ляжаць без усякага руху амаль на працягу году.

Членам прэзыдыуму РайКК быў Зяцікаў—сын кулака. Ён раскрадвае дзяржаўную маёмасьць на чыгунцы.

Калі Лісейчыкава з райкому перавялі ў РВК—дык у райком зноў трапіў кулацкі агент **Навічкоў Нічыпар.** Ён уцёк ад партарганізацыі шкодную дзейнасьць кулакоў у калгасе «Камінтэрн».

Нізавы друк і рабселькораўскі рух у раёне бяз усякага кіраўніцтва. Ім не кіруюць партыйныя ячэйкі. Ня кіруе і рэдакцыя раённай газэты.

Ня прыходзіцца дзівіцца, што насьценгазэта калгасу «Дружба» № 2 апынулася ў руках клясавага ворага, было га гандляра пазбаўленца Рабіновіча.

Насьценгазэты ў калгасах ня выходзяць з часу сьвяткаваньня Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гэта значыць, што яны ня ўдзельнічалі ў загатоўках, у барацьбе з кулацкім сабатажам, ня ўдзельнічаюць у барацьбе за бальшавіцкія калгасы. Старшыня Губіцкага сельсавету **Непачаты** замкнуў насьценгазэту ў шафу.

Нечага зьдзіўляцца, што сельсавет, дзе крытыка на замку, апынуўся у час збожжазагатовак на чорнай дошцы.

Вельмі трывожны сыгнал атрымала рэдакцыя раённай газэты з калгасу «Парыжская Камуна» у складзе праўленьня якога сядзелі тры кулакі, у складзе рэўкамісіі два.

Селькор Доменны піша: «У калгасе «Парыская Камуна» крытыка і самакрытыка ў загоне. З боку праўленьня калгасу і асабліва старшыні Кухаронкава маюцца выпадкі зажыму самакрытыкі.

Старшыня арганізоўвае п'янкі, запалохвае калгасьнікаў.

Насьценгазэта ў калгасе ня выходзіць ужо цэлы год.

Рэдкалегія ня мае ніякай дапамогі, як з боку партыйнай і камсамольскай ячэек, таксама і з боку раённай газэты **«Ленінскі Шлях»**.

А вось паведамленьне рэдакцыі «Ленінскі Шлях» з калгасу «Трактарысты».

«Апошні нумар газэты, які быў выпушчаны да XУ годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, да сёньнешняга дню ня зьменены».

Рэдакцыя раённай газэты не рэагавала на гэтыя сыгналы. Не рэагавала нават, ня гледзячы на тое, што ўжо атрымала папярэджаньне з боку газэты «Рабселькор» у аглядзе друку. «Там, дзе страчана клясавая пільнасьць».

Каб дабіць кулацтва, як клясу, выгнаць з усіх зьвеньняў клясавага ворага, зрабіць кожны калгас бальшавіцкім, атрымаць посьпех у веснавой сяўбе першага году другой пяцігодкі, у выкананьні ўсіх гаспадарча-палітычных задач—кіраўніцтва раёну павінна да канца ачысьціць партарганізацыі ад клясава-чужых і перарадзіўшыхся элемэнтаў, па бальшавіцку заняцца выхаваньнем пільнасьці у кожнага члена і кандыдата партыі, ленінскай непрымірымасьці ў барацьбе за генэральную лінію партыі, разьбіць дашчэнту і зьнішчыць гнілы лібэралізм, па бальшавіцку разгарнуць крытыку і самакрытыку ў партарганізацыі і ва ўсіх зьвеньнях раёну; узяць на належную вышыню кіраўніцтва і работу з нізавым друкам і рабселькорамі.

Той факт, што на чале насьценгазэты калгасу «Дружба» № 2 аказаўся клясавы вораг, што амаль ва ўсіх калгасах раёну насьценгазэты ня выходзяць з 1-га мая і XУ годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі,—настойліва патрабуе глыбокага абсьледваньня стаповішча нізавога друку і рабселькораўскага руху ў Буда-Кашалёўскім раёне.

Ул. Дуброўскі.

15.000 кілё

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Загатоўкі жывёлы па Гомельскім шчыка, ня было вагаў, квіткоў і грошай. Пад вечар, калі канчаўся кароткі рабочы дзень, засьвяцілася агні кас троў, а жывёла катэгарычна заявіла аб сваіх жыцьцёвых патрэбах—піць і паесьці, загатоўцы яшчэ ня прышлі ў сябе.

Далей трэба было-б даць слова майстру пяра: «ледзь-ледзь замроіла ружовае раньне на ўсходнім брыжы небаспаду і па скрыпучым сьнезе папаўзьлі палозьзі сялянскіх санак, якія ехалі на калгасны базар, на загатоўчым пункце закіпела ўдарная работа. Выпісваліся квіткі, сялянам выплачваліся грошы.

Аднак, назаўтра равіцою было таксама хмурна на загатоўчым пункце. Загатоўкі працягваліся тымі-ж вялымі тэмпамі. Спачатку жывёлу адпраўлялі на гаралзкія вагі. Малапісьменны прыёмшчык на кавалачках паперы выдаваў расьпіскі. У сябе ён адзначаў прыёмку крыжыкамі, птушкамі або агульнай вагой. Так працягвалася некалькі дзён. Бедная галовушка прыёмшчыка, як відаць, абалдзела ад такога прыліву. У наступны дні ў прыёмачнай ведамасьці крыжыкі ўжо ня ставіліся, расьпіскі выдаваліся ўсім здатчыкам, а ня групам) на адну каро ву бывала пяць расьпісак). Хто-ні-хто са здатчыкаў тут-жа уводзіў «зданую» карову назад.

Загадчык Гіршын зьявіўся на пункт (больш правільна прыйшоў на пункт, бо ўваход на маленькі дворык і то ідзе праз разбураную прыбіральню) з маленькім спазьненьнем. Але гэта ня важна. Ён прышоў як воін у поўнай гатоўнасьці панесьці вялікія асабістыя ахвяры. Гіршын перастаў есьці і піць. На трэці дзень ён страціў прытомнасьць. І калі прыёмшчык адвозіў яго дадому, жывёла разыйшлася па ўсім горадзе. Прадбачлівыя людзі пасьпяшаліся даць прытулак блуднай жывёле Загатжывёлы. Што-ні-што знайшлі, «што-ні-што» прапала.

Калі весткі аб становішчы дайшлі да мясцовых арганізацый, пастаноўлена было адкрыць яшчэ адзін прыёмачны пункт ў вёсцы Зябраўках. Там паўтарыўся тая-ж драма, толькі з некаторымі варыянтамі. З прычыны адсутнасьці прыёмшчыку міліцыя шукала людзей, зьнешні выгляд якіх нагадваў або прыёмшчыка мяса, або былога скотапрамысловцу, «Мабілізаваныя» людзі пісалі, выдавалі на кавалачках паперы расьпіскі, вызначалі вагу жывёлы «на вока» і занасілі гэта ў прыёмачныя ведамасьці ў пудох, фунтах або цэнтнерах.

Як у Гомелі, так і ў Зябраўках са здатчыкамі разьлічваліся потым. Гэта было зроблена ў той час, калі ў банку Гомельскае аддзяленьне Заготжывёлы мела ня менш 15 тыс. руб., якімі яно магло распараджацца. Сяляне гублялі паперкі, або прыносілі замусоленыя квіткі, на якіх лічбу трэба было ўстаноўляць, як ерогліфы на эгіпецкіх папірусах.

Такая сыстэма работы адразу хваравіта адбілася на бухгальтэрыі, якая і так кульгала на абедзьве нагі.

Ці будзе балянс за 1932 год.—пыталіся ў бухгальтара Расіянскага.

— Наўрад-ці ў 1933 годзе будзе, а калі і будзе, дык няправільны, бо пісулькі ад сялян яшчэ не паступілі, разьмер страт яшчэ не ўстаноўлены,—так шчыра прызнаваўся Расіянскі.

Так, балянс будзе, але ці адаб'ецца там страта 15 тысяч кілё мяса (гэта толькі нармальная «страта вагі»), ці адаб'ецца там столькі-ж кілё мяса, прапаўшых у выніку безгаспадарчасьці, ці знойдзецца тлумачэньне тым 9 тысячам рублёў страт (заўважце, лічба афіцыйная) і яшчэ шмат тысяч ад страт і ад пераплаты грошай.

У колькі дзесяткаў тысяч абыйшліся дзяржаве дні ад 25 да 30 сьнежня, калі гомельская кантора села на мель? Адказы на гэтыя пытаньні павінны быць даны і іх напэўна сфарму люе камісія РСІ.

Гіршын зьняты з работы і ўсяго толькі атрымаў вымову. Яго замяніў Амрокін. Ён працаваў два дні. Зараз часова працуе Фрэйдлін і два інспэктары, з якіх адзін Захарэнка Янка, злосны сабатажнік сельска-гаспадарчых загатовак—«інспэктуе сялян».

Плян перапраў кварталу выконваецца дрэнна (на 17,5 проц.). На лаву пад судных павінны сесьці вінавайцы ўсіх агідныя спраў і распрат дзяржаўных сродкаў.

ГАРЫН.

ГОМЕЛЬ.

Зімовы спорт фізкультурнікаў.

Пра ўдзел калгасаў у лесазагатоўках і лесавывазках

Пастанова Народнага камісарыяту земляробства БССР і ўпаўнаважанага Наркамлесу СССР пры СНК БССР

Адзначыць, што ўдзел калгасаў у лесазагатоўках і лесавывазцы зьяўляецца яўча нездавальняючым. Замест 19195 чалавек, якія павінны штодзень на працаваць для выкананьня пляну лесазагатовак, на працяку 1-й дэкады студзеня 1933 г. працавала штодзенна 12973 чал., з іх калгасьнікаў 2349 чал., па вывазцы лесу замест па трэбных штодзенна 57.050 падвод, працавала за гэты час 19.653, з іх калгасьнікаў толькі 8.469.

Цэлы рад РАЙЗА, леспрамгасаў, лестрангасаў і праўленьняў калгасаў не далі рашучага адпору ўплыву кулацка-варожых элемэнтаў унутры калгасаў, накіраванаму на зрыў лесазагатовак і не вядуць барацьбы з апартуністычнымі разважаньнямі аб тым, што кліматычныя ўмовы перашкаджаюць выкананьню пляну леса вывазкі.

Адзначыць, што зусім нізкая прадукцыйнасьць працы як па калгасным, так і аднаасобным сэктары тлумачыцца адсутнасьцю масавай работы, наяўнасьцю кулацкага ўплыву і адсутнасьцю рашучай барацьбы з кулацкім сабатажам.

Вельмі слаба праводзіцца работа па заключэньні дагавораў з леспрамгасамі па лесавывазцы з лесазагатоўкамі, а рад калгасаў парушаюць заключаныя дагаворы з леспрамгасамі.

Большасьць калгасаў недаацэнілі значэньня скарыстаньня вольнай у зімовы час рабочай і цягавай сілы на лесазагатоўках і лесавывазцы для павялічэньня даходнасьці калгасаў і калгасьнікаў.

Зусім слаба распаўсюджана работа а арганізацыі брыгад, якія апраўдалі сябе на вопыце мінулага году, і арганізаваньня выезды на лесавывазку.

У мэтах узмацненьня работы і за бясьпечаньня большага ўдзелу калгасаў і калгасьнікаў у лесазагатоўках і лесавывазцы, Наркамлесам БССР і ўпаўнаважаным Наркамлесу СССР пры СНК БССР пастанаўляюць:

1. Прапанаваць РАЙЗА, леспрамгасам, лестрангасам і праўленьням калгасаў, правесьці бальшавіцкую масавую работу сярод лесарубаў і возчыкаў, шырока ўкараняючы сацыялістычныя формы і мэтады працы—сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва,—растлумачваючы шкоднасьць кулацкай агітацыі, зламаць кулацкі сабатаж, арганізаваны супроць лесазагатовак і лесавывазкі.

2. Абавязаць РАЙЗА, леспрамгасы, лестрангасы разгарнуць масавую па літычную работу сярод калгасаў і калгасьнікаў аб своячасовым і поўным выкананьні пляну лесазагатовак і лесавывазкі. прапанаваўшы ўсім работнікам, якія працуюць у с-с, увязваць работу па выкананьні пляну заготовак і па падрыхтоўцы да веснавой паўсяўкампаніі з арганізацыяй заключэньня калгасамі дагавораў і масавым выездам калгасаў і калгасьнікаў на леса загатоўкі і лесавывазку.

3. Адначасова шырока папуляризаваць пастанову СНК БССР аб устаноўленьні прэмі'ваньня лесам калгасьнікаў і аднаасобнікаў за выкананьне і перавыкананьне абавязацельстваў па вывазцы дроў і лесазагатоўках і аб дазволе калгасьнікам і аднаасобнікам бесьперашкоднага продажу дроў, атрыманых у якасьці прэміі, згодна гэтай пастановы на калгасных базарах або непасрэдна дзяржаўным і кааперацыйным арганізацыям.

4. Абавязаць праўленьні калгасаў арганізаваць выезд калгасьнікаў на лесавывазку брыгадамі на чале з брыгадзірамі, якія павінны разам з брыгадай выяжджаць на работу із вывазцы лесу.

Ускласьці на брыгадзіра абавязкі сачыць за захаваньнем цягавай сілы, збруі, саней і калёс, патрабуючы поўнай адказнасьці з боку калгасьнікаў за становішча іх. Арганізаваць, як правіла, агляд, коняй пры выхадзе са стайні і па прыбыцьці з работы.

Для большай зацікаўленасьці брыгадзіраў калгасных абозаў у рабоце па кіраваньні брыгадай і для сувязі брыгадзіраў з леспрамгасамі вызначыць за кошт леспрамгасаў аплату старэйшым брыгадзірам апроч іх асноўнага заработку ў разьмеры 3 проц. ад агульнай сумы заработку калгаснага абозу.

5. Абавязаць леспрамгасы бездакладна выдаваць пасьля выкананьня пляну прэмі дровамі ў разьмеры ня больш 5 проц. ад колькасьці вывезенага дрэва па прэйскурантным цэнах НК Лясной прамысловасьці.

Абавязаць праўленьні калгасаў не перашкаджаць калгасьнікам у арганізаваным выезьдзе на базары для продажу атрыманых імі ў якасьці прэміі дроў, альбо садзейнічаць непасрэднаму продажу атрыманых дроў дзяржаўным і кааперацыйным арганізацыям.

6. Папярэдзіць загадчыкаў РАЙЗА, што яны нясуць асабістую адказнасьць за выкананьне дагавораў калгасамі па вывазцы і загатоўцы леса матар'ялаў. РАЙЗА і праўленьні калгасаў павінны на справе забясьпечыць такую садзейнасьць і практычную дапамогу леспрамгасам у лесазагатоўках, каб пляны лесазагатовак былі абавязкова выкананы ва ўстаноўленыя тэрміны.

Абавязаць усе калгасы па заключаных дагаворах з гаспадарчымі арганізацыямі вылучыць усю патрэбную гужавую сілу, памідзіўшы ў калгасе мінімальную колькасьць, неабходную для гаспадарчых патрэб.

Прапанаваць РАЙЗА і леспрамгасам устанавіць строгі ўлік і кантроль за выкананьнем калгасамі сваіх дагаворай прыцягваючы вінаватых у зрыве пляну лесазагатовак і лесавывазкі да строгай адказнасьці.

7. Не дапускаць ніякіх адлічэньняў ад заработку калгасьнікаў пры рабоце без каня. Увесь заработак калгасьнікаў пры рабоце без каня цалкам паступае ў распараджэньне калгасьнікаў.

Адлічэньні ад заработку калгасьнікам па вывазцы лесу на калгасных конях пры забясьпечаным каня кармамі калгасаў не павінен быць больш 30 пр.

Разьлік з калгасьнікамі праводзіцца непасрэдна леспрамгасамі, прычым калгасьнік атрымлівае на рукі ад леспрамгасу 70 проц. заработнай сумы, астатняя 30 проц. пералічваюцца на б-рахунак калгасаў у Дзяржбанку.

Абавязаць РАЙЗА і леспрамгасы строга сачыць за выкананьнем устаноўленага парадку аплаты працы калгасьнікаў па лесазагатоўках і лесавывазцы.

Нарком БССР РАЧЫЦКІ

Упаўнаважаны Наркамлесу СССР пры СНК БССР. РОЗІН.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Па сьлядох рабселькораўскіх допісаў

Работнікі Губіцкага сельсавету (Буда-Кашалёўскі раён) Пахомаў, Шаўцоў, Гайшуноў, Круцікаў зьдзекваліся над чырвоным партызанам т. Дзедушкавым Якавам. Абкладалі яго непасільным падаткам, самаабкладаньнем, нарыхтоўкамі і г. д. Выкрэсьлілі яго са сьпісу чырвоных партызан і абклал індывідуальным падаткам у той час, як гаспадарка яго была звычайная серадняцкая. Работнікі Губіцкага сельсавету ішлі на павадку ў клясавага ворага, які помсьціў чырвонаму партызану. На гэты шлях сталі і работнікі РВК, якія ўсе скаргі Дзедушкава застаўлялі бяз вынікаў.

У гэтую справу ўмяшалася «Савецкая Беларусь» і ў № 51 зьмясьціла допіс свайго карэспандэнта пад загалоўкам «Губіцкіх агентаў кулака, арганізатараў ганеньня на чырвонага партызана—да суровай адказнасьці». І толькі пасьля сыгналу «Савецкай Беларусі» гэтай справай заняліся Буда-Кашалёўскі РК і РКК, якія адзначылі на сваім паседжаньні, што ў Губіцкім сельсавеце сапраўды былі кулацкія агенты, а работнікі РВК праявілі фармальна - бюрократычныя адносіны пры разглядзе скарг Дзедушкава.

Аб'яднанае бюро РК і РКК вынесла работнікам РВК Шкабарыну і РайФА суровую вымову. Былы старшыня Губіцкага сельсавету, Рупан зьнят з работы з суровым партспагнаньнем і сакратар партячэйкі Цыгейтус выключаны з партыі, яшчэ раней. Круцікава Пракопа, як актыўнага арганізатара ганеньня на чырвонага партызана, аддалі пад суд. У адносінах тав. Гаўшунова, які прымаў удзел у ганеньні на чырвонага партызана, справа перадана парткалектыву камвузу імя Леніна, дзе ён зараз знаходзіцца.

*

У апарат забясьпечаньня Нёманскага леспрамгасу пралезьлі кулакі Бэрнштэйн, Займан, Цукерман, якія ўсімі спосабамі падрывалі загатоўку, вывазку і сплаў лесу, у выніку гэтага прамплян па леспрамгасу быў сарваны.

Старшыня Нёманскага лесрабкопу і дырэктар леспрамгасу ніякіх мер ня прымалі да таго, каб зьнішчыць тыя брыдоты, якія былі ў органах забясьпечаньня леспрамгасу. Аб гэтым быў зьмешчаны ў № 127 «Савецкай Беларусі» селькораўскі допіс. Допіс быў праверан і цалкам пацьвердзіўся. Пракуратура рэспублікі паведамляе, што кулакі з органаў забясьпечаньня леспрамгасу выгнаны, а дырэктар леспрамгасу і старшыня лесрабкопу аддадзены пад суд.

«Савецкая Беларусь» у № 160 зьмесьціла селькораўскі допіс «Слова за Пракурорам Рэспублікі»—пра злачынствы работнікаў Бесядзкага сельсавету і сельспажтаварыства (Мазырскі раён).

Пракурор Мазырскага раёну паведамляе, што допіс пацьвердзіўся.

У адносінах злачынства сельсавецкіх работнікаў узята сьледства, а работнікі сельспажтаварыства, у ліку 7 асоб, арыштаваны.

*

Старшыня калгасу «Авангард» (Навасёлкаўскі сельсавет, Мазырскі раён) Шуляк замест здачы (продажу) збожжа дзяржаве, 8 пудоў прадаў спэкулянтам. Член таго-ж Навасёлкаўскага сельсавету Мятлушка Рыгор са аддзенага збожжа ў сельсавет чырвоным абозам 32 клг прадаў на прыватным рынку па спэкуляцыйных цэнах.

Кулакі Капліцкага сельсавету—Калтык, Мартынаў, Каваленка Ал., Каваленка Якім, Жураў Сяргей прадаюць збожжа на прыватным рынку. Пра гэтыя злачынствы «Савецкая Беларусь» у № 194 зьмясьціла селькораўскі допіс пад загалоўкам «Да адказнасьці за разбазарваньне збожжа».

Мазырская райпракуратура паведамляе, што допіс цалкам пацьвердзіўся. Супроць Шуляка, Мятлушкі і кулакоў Баштыка і інш. пракуратура ўзьняла судовыя справы за парушэньне пастаноў партыі і ўраду пра гандаль збожжам.

*

Селькор у сваім допісе («Савецкая Беларусь», № 206) пісаў, што Дубровенскі райспажсаюз разбазарыў настаўнічкі фонд і з гэтай прычыны настаўнікі па 3 месяцы не атрымоўвалі прадуктаў.

Пракурор Дубровенскага раёну паведамляе, што допіс пацьвердзіўся. Райміліцыі прапанавана ўтварыць сьледства і накіраваць справу ў суд.

*

У нумары 172 «Савецкай Беларусі» быў зьмешчаны ліст селькора пад загалоўкам «Выратуйце калгас ад развалу». Селькор у сваім лісьце выкрыў злачынствы праўленьня калгасу «Гарадок» (Пухавіцкі раён), якое сыстэмаычна п'янствавала, сахўрусавалася з кулакамі і вяло работу па разбурэньні калгасу.

Пухавіцкая РКК паведамляе, што ліст цалкам пацьвердзіўся. Старшыня калгасу Слуцкі з работы зьняты, зроблены перавыбары праўленьня калгасу.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса ад 12 г. дня

Ад 7 лютага мастацкі фільм вытворчасьці Украінфільм

КАЛАМУТА

11 лютага а 7 гадз. увеч. у памяшк. клюбу імя Леніна (вуліца Урыцкага)

адкрываецца

Менская раённая канфэрэнцыя асьвет нікаў

Парадак дня: 1. Вынікі аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і задачы прафарганізацыі, 2. Справаздача гаркому саюзу і раўкамісіі, 3. Выбары гаркому. Мандаты абраным дэлегатам можна атрымаць у ГК саюзу працасьветы.

Прэзыдыум ГК саюзу.

ПАТРАБУЕЦЦА:

для Бабруйскага закрытага ваеннага каапэратыву

ПЛЯНАВІК - ЭКАНАМІСТ

ПЛАТА ПА ДАГАВОРАНАСЬЦІ

Праўленьне ЗВК

Рэдакцыі газ. „Савецкая Беларусь" на вечарнюю работу

ПАТРЭБНА

ВОПЫТНАЯ МАШЫНІСТКА,

якая ведае добра беларускую мову

Зьвяртацца: Плян Возі, 17 (бул. ЦВК), тэл. 22-161

Даведачна-інфармацыйная кантора ПРЫ БЕЛКІРАЎНІЦТВЕ СУВЯЗІ

Менск, Ленінская, 28, тэлеф. па аўтамаце 22752

Гэтым паведамляецца, што ва ўсіх раёнах БССР у райаддзелах сувязі

прымаюцца розныя роду аб'явы

балянсаў, паведамленьняў і інш. матар'ялы рэклямнага характару для зьмяшчэньня ў газэце

„Савецкая Беларусь"

ПАСТАНОВА

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

8 лютага 1933 г.

Аб вызначэньні па кожным доме адказных асоб за прапіску ў аддзяленьнях міліцыі гор. Менску дакумантаў асоб, прыбываючых на жыхарства ў гор Менск і ўбываючых з яго

У мэтах удасканаленьня прапіскі дакумантаў асоб, прыбываючых на жыхарства ў гор. Менск і ўбываючых з яго, Менскі Гарадзкі Савет Рабочых Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць праўленьні жактаў вызначыць па кожным доме адказную асобу за прапіску дакумантаў прыбываючых і ўбываючых грамадзян.

2. Абавязаць усе прадпрыемствы, дзяржаўныя ўстановы і грамадзкія арганізацыі, маючыя належныя ім дамы і інтэрнаты, у якіх пражываюць рабочыя і служачыя, а таксама і адміністрацыю гасьцініц і заезных двароў вызначыць па кожным доме, інтэрнаце, гасьцініцы, заезным дварэ адказную асобу за прапіску дакумантаў прыбываючых і ўбываючых грамадзян.

3. Ускласьці абавязак прапіскі дакумантаў прыбываючых і ўбываючых грамадзян па прыватных домах на ўласьнікаў гэтых дамоў.

4. Абавязаць жыльёвую каапэратыву, адміністрацыю прадпрыемстваў, дзяржаўных і грамадзкіх устаноў і арганізацый да 15-II 1933 г. прадставіць галоўнаму кіраўніцтву РС міліцыі пры СНК БССР (г. Менск, Камуністычная, 1-7) сьпісы адказных асоб, вылучаных паводле п. п. 1 і 2 гэтай пастановы па кожным доме, інтэрнаце, гасьцініцы і заезным дварэ, па наступнай форме: №№ п. ч., прозьвішча, імя і імя па бацьку, год і месяц нараджэньня, партыйнасьць, сацыяльнае становішча, месца службы і пасада, па якім доме вылучан адказным (паказаць вуліцу і № дому). Хатні адрас.

УВАГА: Домаўладальні, належачыя прыватным асобам, гэтых зьвестак не прадстаўляюць.

5. Ускласьці абавязак на вылучаных адказных асоб па кожным доме, інтэрнаце, гасьцініцы, заезным дварэ:

а) хаваньне дамовых кніг;

б) патрабаваньне ад прыбываючых і выбываючых грамадзян дакумантаў для прыпіскі;

в) нагляд за своячасовым і дакладным запаўненьнем картак на прыбыўшых і ўбыўшых і запісаў у адведных графах дамовых кніг неабходных зьвестак;

г) нагляд за своячасовым прадстаўленьнем у аддзяленьні міліцыі гораду Менску для прыпіскі дакумантаў.

6. Вінаватыя ў непрадстаўленьні ва ўстаноўлены тэрмін патрабуемых зьвестак адказныя асобы на прыпіску прыцягваюцца да адказнасьці ў адміністрацыйным парадку—штрафу да 100 руб., або прымусовых работ да 15 дзён.

Нам. старшыні Менскага Гарсавету—Караneўскі

За сакратара Гарсавету—Ягоўдзік

Згубленую ламавую кнігу па вул. Апанскага, дом № 56 на імя Сярбаловіч У. В. Лічыць страціўшай моц

Згублены загад, выд. дзяржарбітражам ад 22 лютага 1932 году Віцебскаму аддзелу Безбудкаторы па спагнаньне 11388 руб. 51 кап. в клюбу фабрычкі „Дзьвіна" Лічыць страціўшым моц

Пасьведчаньне асобы, выд. Менскай міліц. на імя Рак Н. М., квіт 24

Вайсковы білет, выданы Адэскім акраваенкам. на імя Эпэльбаум Л. М., квіт № 25.

Членскі белет, выданы саюзам с а ў г а н д л ю № 6218924 на імя Турцэвіч Л. Я., кв. 26

Вайсковы білет, выданы Холміцк. ваенкам. № 233 на імя Турцэвіч Л. Я., квіт 27.

Членскі білет, выданы саюзам будаўнікоў на імя Каплан Ц. Г., кв. 28.

Мэтрычны выпіс, выд. Менскім загсам на імя Стэрлін Л. В., квіт 20

Вайсковы білет, выданы аддзел. сап. эскадр. на імя Шышоў М. Г., кв. 30

Пасьведчаньне, выданае чырвонаарм. гарміліц. на імя Рабіновіч С. Б., квіт № 31.

Пашпарт выданы Бароўскім сельсав. на імя Сабалеўскай Н. Ц., квіт 32

Пашпарт., выданы Бараўскім сельсав. на імя Маркевіч В. П., квіт 33.

Пэнсійная кніжка, выд. Менскай с т р а х к а с а й № 3898 на імя Шыманскі С. Л., квіт 34.

Членскі білет выданы саюзам будаўнікоў на імя Гільдзінэр Б. Б., квіт 36

Членскі білет, выданы чаўнам чыгун. № 100492 на імя Укуліч А. Ц., квіт № 37.

Партбілет за № 1626544 на імя Супрон М. Я., квіт № 39.

Поліс асоб страхав. № 116996 на імя Васільеў П. І., квіт 40.

Мэтрычны выпіс, выд. Менскім загсам, на імя Фурман М. М., квіт 41

Вайсковы білет, выданы Самэхвазав. раёнам на імя Бачыло А. А., квіт 42

Вайсковы білет, выданы Менскім ваенкамат. на імя Галец А. Ц., квіт 43.

Партбілет № 0818488, выд. Менскім акружкомам партыі на імя Лобік Ф. Я., квіт 1.

Членскі білет саюзу харчавікоў на імя Лобік Ф. Я., квіт 2.

Партбілет № 0225